Літаратурная Беларусь

Выпуск №12 (148)
(снежань)


КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Процістаянне рамантыкаў і рэалістаў,
або што матывуе беларускую крытыку?

Беларускі інтэлектуал любіць троіцу. Пасля дыскусіі, прысвечанай новай, «папулярнай» хвалі беларускай літаратуры і прыватнага джазу Максіма Жбанкова ў кнігарні «Логвінаў» сабраліся людзі, гатовыя паразважаць, чаму беларуская літаратурная крытыка «не працуе».



Фота Таццяны Шаўцовай

Дыскусію арганізавалі Саюз беларускіх пісьменнікаў і Беларускі Калегіум. Вядоўцамі былі Ціхан Чарнякевіч і Ігар Бабкоў.

Сцісла праблему акрэслілі так: «Крытыка ёсць ці крытыкі няма? Літаратура мае ў ёй патрэбу, ці крытыка мае патрэбу ў літаратуры? На першы план выходзяць стракатыя рэкламныя агляды, «дзясяткі найлепшых», рэпублікацыі пастоў у сацсетках. Крытычны тэкст дрэйфуе ці то ў літаратуразнаўчы аналіз, ці то ў публіцыстычную нататку. Якім чынам мусіць бытаваць крытыка цяпер і ці патрэбна ствараць пляцоўку для яе/іх гуртавання?»

Найпершае пытанне: што такое літаратурная крытыка? Кампаньён літаратуры, абслуга ці асобны від мастацтва?

Іранічны Валянцін Акудовіч адпачатку зазначыў, што пра неіснаванне ліккрытыкі ў Беларусі пісаў яшчэ дваццаць гадоў таму. З таго часу некалькі разоў падымаўся вэрхал пра сакральную адсутнасць. Калі нечага так доўга няма — гэта паказальна. Спадар Валянцін увёў у дыскусію панятак «спакушальніка». Што матывуе крытыка? Паводле Акудовіча, галоўны спакушальнік той, у каго ёсць грошы. Калі праца будзе аплочвацца належна, уласна крытычных тэкстаў стане больш. Схема да болю простая: не існуе попыту на ліккрытыку — і яе «няма». Згадалі працу крытыкаў Заходняй Еўропы, дзе існуе культурная індустрыя. Буйныя выдавецтвы надзвычай зацікаўленыя ў крытыцы, а шматлікія выданні маюць такую штатную адзінку, як ліккрытык. У такім стане рэчаў, аднак, ёсць свае адмоўныя моманты: па-першае, у такім выпадку ліккрытык губляе незалежнасць і разбор тэкстаў робіцца абавязкам, становіцца на канвеер. Па-другое, краіны, якія маюць развітую і здаровую культурную індустрыю, працуюць з іншымі аб'ёмамі літаратуры. Тут размова можа ісці пра тысячы новых раманаў штомесяц. Ідэал — у недасяжнай залатой сярэдзіне, паміж канвеернай вытворчасцю ды забяспечанасцю ліккрытыка на Захадзе і галоднымі менестрэлямі ў «роднай старане».

Міхал Бараноўскі вызначыў іншы від «спакушэння» — твор, які зачэпіць, не пакіне абыякавым, стане вымагаць ад крытыка водгуку. Абодва спакушальнікі значныя і мусяць існаваць у працэсе адначасова. Адпаведна ўзнікае пытанне: ці здольная беларуская літаратура спакушаць?

З Ганны Кісліцынай і кнігі «Blonde attack», па меркаванні Бабкова, пачаўся бунт беларускіх крытыкаў: «Яна першая напрыканцы 1990-х паспрабавала змяніць вобраз крытыкаў: не крытыка прыдатак да літаратуры, а наадварот. Літаратура — толькі нагода, каб выйсці ў прыгожай чырвонай сукенцы і расказаць, як я стамілася ад вашых графаманскіх тэкстаў». Калі Кісліцына запачаткавала крытыку-шоў, то наступніцы Лідзія Міхеева і Марыя Мартысевіч змянілі ракурс бачання, перастаўшы расстаўляць эстэтычныя адзнакі. Для іх мастацкі тэкст — нагода для размовы пра грамадства, уласныя перажыванні і г.д. Потым прыйшоў Ціхан Чарнякевіч, для якога «гранічна важна, што крытыка — частка літаратуры, ні ў якім разе ні журналістыкі, філалогіі ці нейкай яшчэ навукі. Калі літаратура — галюцынацыі аўтара з нагоды рэчаіснасці, то крытыка — тыя ж галюцынацыі, толькі з нагоды літаратурнай рэчаіснасці». Кажучы працэй, літаратура пераасэнсоўвае рэчаіснасць, крытыка — літаратуру. Наступная ступень — пакаленне «маладой шпаны», якое свядома задзірае ўсіх...

Гэтую прыгожую схему традыцыйна дэканструяваў Валянцін Акудовіч. Ён падкрэсліў: усе яркія асобы з часам зніклі. Атрымаўшы магчымасць пісаць пра што заўгодна пасля заваявання «сацыяльнага капіталу» — не пішуць, ці вельмі рэдка. «Ахвяраваць уласнаю творчасцю на тое, каб пісаць пра чужую прозу-паэзію, — на гэта мала хто пойдзе. Ніхто да гэтага не гатовы».

Калі ўлічыць, што крытык як прафесія ў нас не каціруецца і попыт на гэты від мастацтва малы, мы прыйдзем да чарговага пытання: чаму літаратурная крытыка існуе, нягледзячы на ўсе праблемы?

У Івана Новіка маецца адказ асабістага кшталту: «У мяне цудоўная ідэнтычнасць — я філосаф. І я пішу для сябе, бо не магу без таго абысціся». Пра залежнасць ад прагі мыслення казаў Ціхан Чарнякевіч: «Трэба дачакацца эмоцыі, калі цябе пакліча кніга, калі ты падумаеш, што яе зразумеў, і пачаць разважаць. І ты атрымліваеш ад гэтага неверагодны кайф, які значна важнейшы за грошы. Думаю, гэты кайф мае чыста пісьменніцкія карані». Немалую ролю адыгрывае самаідэнтычнасць крытыка, сувязь з літаратурнай традыцыяй.

Увогуле, гэтая дыскусія сталася процістаяннем рамантыкаў і рэалістаў. Калі Бабкоў бачыць крытыку ў ідэалістычным ключы («не імкненне да грошай, славы, прэстыжу, а спроба зразумець, што мы тут робім, у гэтым свеце»), то Акудовіч настойваў на тым, што крытык — гэта прафесія, і як прафесіянал ён мусіць мець магчымасць паўнавартасна жыць са сваёй працы. «І пісьменнікі, і крытыкі ўсё адно будуць рабіць сваю справу, здабываючы сродкі на існаванне з іншых крыніцаў. Але гэта не значыць, што такі стан рэчаў — нармальны. Пакуль рамантызм адносна крытыкі будзе існаваць, ніколі крытыка не складзецца ў сістэмную, працаздольную, эфектыўную з'яву. Пакуль і знаку няма, што нехта думае, як гэта зрабіць. Пакуль што — адны паэтычныя рэфлексіі».

Самым жыццяздольным шляхам пры такім стане рэчаў паўстае праца наўпрост з аўдыторыяй, для чаго сеціва дае бязмежныя магчымасці. А вось секцыі крытыкі ў пісьменніцкіх саюзах ды іншыя фармальныя аб'яднанні — абсалютна мёртвы кантэкст, які ўжо ніколі не адродзіцца.

І вельмі важна ствараць асяродак. «Калі ў нас ёсць прыўкрасныя крытыкі, ім трэба казаць пра гэта сёння, а не пісаць лісты на магілку», — кажа Ігар Бабкоў.

Не трэба з усім пагаджацца — здаровая дыскусія заўжды патрэбная. Як неабходны дыялог, каб ведаць, што нехта яшчэ ў гэтай прасторы ёсць...

Наста Грышчук



Снежаньская Рада СБП

У культурніцкай прасторы «Тартак» на вуліцы Магілёўскай прайшло заключнае ў 2018 годзе паседжанне кіроўнага органа ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».

У праграме было некалькі важных пунктаў, сярод якіх — уганараванне лаўрэатаў Літаратурнага конкурсу «Экслібрыс», які сёлета быў прысвечаны знакавай падзеі — 100-годдзю абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дыпломам І ступені быў уганараваны Зміцер Астроўскі, дыпломам ІІ ступені — Андрэй Кулеш, дыпломам ІІІ ступені — Яўген Аснарэўскі. Заахвочвальныя дыпломы журы прызначыла Марыі Шэбанец і Паўлу Бракаву.

Другім, не менш важным пытаннем паседжання было прыняцце новых сяброў арганізацыі. Пасля прадстаўлення кандыдатаў старшынёй Прыёмнай камісіі СБП Аксанай Спрынчан, сябры Рады таемна прагаласавалі і прынялі ў сябры ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» Васіля Герасімчыка, Алеся Замкоўскага, Міколу Канановіча і Таццяну Яцук.

Завяршылася паседжанне абмеркаваннем дзейнасці абласных філій ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і пытаннямі падрыхтоўкі рэгіянальных літаратурных альманахаў.

Прэмія «Ганаровы грамадзянін Цэнтральнай Еўропы»

Першай лаўрэаткай новай прэміі, якая ўручаецца за ўнёсак у развіццё дэмакратыі і грамадзянскай супольнасці, стала Святлана Алексіевіч.



Узнагарода заснаваная сёлета Цэнтральнаеўрапейскім форумам (CEF) — міжнароднай арганізацыяй, якая існуе 10 гадоў. У кансультатыўную Раду ўваходзяць такія вядомыя інтэлектуалы, як Адам Міхнік (Польшча), Міклаш Харасці (Вугоршчына), Славенка Дракуліч (Харватыя), іншыя еўрапейскія дзеячы культуры і палітыкі.

«Ваша прысутнасць на цырымоніі — гонар для народа маёй краіны», — напісаў у запрашальным лісце прэзідэнт Славацкай Рэспублікі Андрэй Кіска. Ён пры гэтым адзначыў «надзвычайную важнасць справы», якую робіць беларуская пісьменніца.

Цырымонія ўручэння прэміі, прымеркаваная да ўгодкаў падзеяў 1989 года ў Чэхаславаччыне, прайшла ў Браціславе на плошчы Славацкага нацыянальнага паўстання. Падчас цырымоніі быў зачытаны ўрывак з кнігі Святланы Алексіевіч «Час сэканд-хэнд» у славацкім перакладзе.

Прэзентацыя «Панядзелка» Мойшэ Кульбака

Кнігу «Панядзелак» — пераклад з ідышу рамана выдатнага «міжваеннага пісьменніка Беларусі» Мойшэ Кульбака — прэзентавалі ў сталічнай Галерэі TUT.BY.

«З Вільні ў 28-м годзе ён зноў вяртаецца ў Менск. Фактычна гэтае вяртанне каштавала яму жыцця, — сказаў перакладчык Сяргей Шупа. — Пасля таго, як ён быў забіты ў тую чорную ноч, калі было забіта больш за 100 прадстаўнікоў творчай, палітычнай і грамадскай эліты 29–30 кастрычніка 1937 года, на дваццаць гадоў імя Кульбака было, прынамсі, у гэтай частцы свету, выкраслена з усіх кніг жыцця і смерці».

У міжваеннай Савецкай Беларусі мова ідыш разам з беларускай, польскай і расійскай мела статус дзяржаўнай. На ёй працавалі каля трох соцень агульнаадукацыйных школ і некаторыя факультэты ВНУ.

Максім Каўняровіч, racyja.com

Дагуляюцца, як цяля на вяроўцы…

(Памфлет)

Здаровы Сэнс адчуваў сябе пагана. Галава трашчала, як пасля перапою. Ён намачыў рушнік і паклаў халоднае на лоб. Маральны стан быў яшчэ горшы: яго самаацэнка імкнулася да нулявога паказчыку.

Ніколі і нідзе яго так не ігнаравалі, як у гэтай адносна невялікай, але амбіцыйнай краіне. Апанавалі сумненні і пытанні. Калі ён неабходны асобным індывідуумам для нармальнага існавання ў соцыуме і сям'і, то чаму з ім не лічацца людзі дзяржаўнага маштабу?

Чым большая ў чалавека пасада, чым вышэй ён узнімаецца па кар'ернай лесвіцы, тым лацвей яму пляваць на ўсе довады З.С. (будзем нашага героя называць скарочана). Здольнасць мысліць канструктыўна і цвяроза знікае. Якую сферу дзейнасці ні вазьмі, паўсюль дзівосы і адсутнасць логікі.

Асабліва ў фінансах. Калі дзяржава ў даўгах, як у шаўках, то чаму яна так раскідваецца грашыма? На першым месцы па затратах, вядома, Мінск. У сталіцы ўсё з барскім размахам. Будуецца, скажам, Вярхоўны суд. Якраз насупраць прэзідэнцкага палаца, велічны і пад неба. Наўрад ці ён будзе лепшы за ўсе астатнія суды. Наб'ецца туды, як семак, юрыстаў і пераносчыкаў папер — з тых, хто «піша і ножкаю калыша». Давядзецца ж запоўніць усе паверхі і кабінеты.

Найбольш сродкаў убухана ў праспект Пераможцаў. Вулічны дызайн ля стэлы перараблівалі разы са тры. На плошчы Дзяржаўнага сцяга ўстанавілі спаруду рэдкай дарагавізны і непатрэбнасці. Называецца яна «Дошка гонару». Уганараваныя павернуты тварам да пустой плошчы (там толькі дзяжурныя мерапрыемствы зрэдзьчасу праводзяцца), а да горада — спіною. А на людны праспект «Пераможцаў Машэрава» глядзяць чатыры вялізазныя экраны — мітусяцца з шалёнай хуткасцю каляровыя карцінкі.

«Для каго «кіно?»» — губляецца ў здагадках Здаровы Сэнс. Гандлёвы цэнтр «Замак» далекавата. З ліквідацыяй пешаходнага перахода не стала, натуральна, пешаходаў. А электронныя экраны мільгацяць, ад'ядаюць кавалкі ад бюджэта... Дык яны з картэжу відны, калі чорныя машыны імчацца ў Дразды. А што як кіроўца загледзіцца? Менш саноўнаму транспарту таксама непажадана сляпіць вочы.

Пару гадоў таму перавярнулі і замянілі тратуарную плітку на ўсіх вуліцах Мінска, незалежна ад ступені яе зношанасці. Жывенька так, шустранька праца ішла... Ведаць бы, пад каго легла гарадское чынавенства, каму хацела дагадзіць, чый рахунак папоўніўся. Адбойнымі малаткамі зліквідавалі навесы на пераходах ля ГУМа, зрабілі новыя, больш адпавядаючыя архітэктурнай стылістыцы. А хто спраектаваў, зацвердзіў ранейшыя — з іх зарплат хоць капейку вылічылі?

Возьмем наземны транспарт. Навучыліся ездзіць як у Германіі — з дакладнасцю да хвіліны, ды чамусьці парабілі здвоеныя рэйсы. Аўтобусы на прыпынкі прыбываюць адначасова, па прынцыпе «мы з Тамарай ходзім парай». Прамежкі паміж рэйсамі доўгія, «пасажырапаток» цярпліва чакае. Зноў жа, напіхалі электронікі ў пасажырскі транспарт. Ужо ж папяровы талон можна было прабіць простай жалезкай... Камеры відэаназірання ў салонах пацягнулі на кругленькую суму. А галоўнае — навошта яны? На які ляд? Не зайцоў жа — пенсіянераў — высочваць. Хай дзяржава эканоміць на чымсьці іншым, а не на старых людзях.

А грошыкі трэба, вельмі трэба! Медыцына сядзіць без рэагентаў і даўным-даўно не правярае пацыентаў на вязкасць крыві. Бываюць перабоі з рэагентамі на праверку гармонаў. На УЗІ сэрца чарга ў паліклініках на некалькі месяцаў. Адна жанчына нядаўна паскардзілася, што чакала два гады. За гэты час можна аддаць Богу душу, і помнік паспеюць паставіць.

Грошай не тое што няма, недзе яны ёсць. У кашальках памерам з саквояж. Хто ў нас адказвае за выкананне бюджэта і расходаванне фінансаў? Правільна, Камітэт дзяржаўнага кантролю. Не было і не будзе там больш талковага кіраўніка, чым Анатоль Тозік. Пры ім камітэт рэальна разглядаў звароты, а не адсылаў іх на месцы да пісцоў-валакітчыкаў.

«Адкрыю я іхні сайт. Пагляджу», — вырашыў пакрыўджаны З.С. і шчоўкнуў мышкай.

Старонка адкрылася. У адрасным радку напісана штосьці незразумелае: «Руская версія». Руская версія чаго? Напісалі б «Комитет госконтроля» — і ўсё стала б на месца. Што, скажыце, пракантралюе ўстанова, якая не здольна кантраляваць сваіх тэхнічных супрацоўнікаў?! А можа справа не ў іх? Беларускай жа версіі няма, ёсць толькі інфармацыя з Вікіпедыі.


Здаровы сэнс аж пахаладзеў ад здагадкі. Скінуў рушнік і забегаў па сваім халасяцкім пакоі. Вось яно што... Не можа быць! Так хутка! Ці не пра гэта прагаварыўся пасля паездкі ў белакаменную рэктар БДУ Андрэй Кароль? Адбываецца сінхранізацыя! То бок няспешнае паглынанне, паўзучая інкарпарацыя.

Перш зраўняем законам мовы, паступова школу перавядзём (дзе яшчэ не пераведзена), падрэжам тым самым карэнне літаратуры (бо хто спажываць будзе беларускае пісьменства?)... «А я, дурань усё пра грошы ды пра эканомію», — вылаяў сябе Здаровы Сэнс. — Во дзе міна замаруджанага дзеяння! Дагуляюцца яны, як цяля на вяроўцы, з гэтай сваёй Саюзнай дзяржавай!»

Галіна Каржанеўская, naviny.by

Прыём заявак на прэмію «Дэбют» імя Багдановіча

Стартуе новы сезон літаратурнай прэміі «Дэбют» імя Максіма Багдановіча. Прэмія прысуджаецца штогод за найлепшую дэбютную папяровую ці электронную кнігу на беларускай мове.



«Дэбют» уганароўвае маладых аўтараў, што пішуць у жанрах, у якіх працаваў Максім Багдановіч, і ўручаецца ў намінацыях «Проза», «Паэзія», «Мастацкі пераклад».

Для ўдзелу ў конкурсе да 31 студзеня 2019 года неабходна:

- запоўніць адмысловую форму;
- даслаць на info@pen-centre.by электронную версію кнігі з тэмай «Дэбют»;
- перадаць або даслаць на офіс Беларускага ПЭН-цэнтра (220005, Мінск, вул. Залатая Горка, 2-101) 2 асобнікі, калі яна выходзіла ў папяровым варыянце.

Да разгляду прымаюцца дэбютныя кнігі, напісаныя на беларускай мове ці перакладзеныя на яе (намінацыя «Мастацкі пераклад»). Узрост аўтара або перакладчыка — да 35 гадоў на момант выдання.

Пераможца прэміі ў кожнай намінацыі атрымае ўзнагароду, эквівалентную 2000 даляраў ЗША. Таксама журы можа прыняць рашэнне пра ўручэнне заахвочвальных прызоў, эквівалентных 500 далярам. Колькасць заахвочвальных прызоў вызначаецца журы.

Прэмія «Дэбют» імя Максіма Багдановіча ўручаецца з 2011 года. Арганізатары прэміі: дабрачынны фонд «Вяртанне», Беларускі ПЭН-цэнтр, Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Прэс-служба СБП

Роднаму слову адданасць

(Да 100-годдзя Фёдара Янкоўскага)

Калі на зямлі ёсць людзі-паходні, якія асвятляюць шлях многім наступнікам, то, безумоўна, з такіх людзей — Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі (1918–1989), вучоны-лінгвіст, доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, пісьменнік, фалькларыст.

Я добра ведаў Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага. Першы раз мы сустрэліся ў Берасці, калі ён завітаў да Уладзіміра Калесніка, свайго сябра і майго настаўніка. Бліжэй пазнаёміліся пасля майго пераезду ў Менск.

Нярэдка сустракаліся ў горадзе, гаманілі. Адзін аднаму дарылі свае кнігі з аўтографамі, пасылалі віншавальныя паштоўкі. Некалькі разоў быў я запрошаны да яго ў госці, ведаў жонку Сірафіму Андрэеўну, настаўніцу, не менш прыязную, чым гаспадар. Гэта была яго другая жонка, першую разам з дзіцем знішчылі гітлераўцы. Трагедыю юны воін перажываў цяжка і мужна. Ён і сам мог загінуць, бо ніхто на вайне не застрахаваны ад смерці. І раней, у 1939-м, ледзьве ацалеў, кінуты сталёвай рукою савецкай таталітарнай сістэмы пад Выбарг — ваяваць з фінамі. Бачыў процьму забітых, маладзенькіх, такіх, як і сам, байцоў. Гінулі яны не толькі ад куляў і асколкаў — забойцам часта аказваўся пасярод глыбокіх снягоў суровы паўночны мароз, якому іх выдаваў здраднік сон... Там Фёдар неяк пашанцавала, ён выйшаў з снежна-ледзяной труны, хоць і вярнуўся з той вайны цяжкапаранены і з абмарожанай пятою.

Фёдар Янкоўскі не проста партызаніў, ён стаў начальнікам баявой і агентурнай разведкі атрада «Грозны», што дзейнічаў супраць акупантаў на Меншчыне. Адважны разведчык рызыкаваў не раз жыццём сваім і баявых сяброў.

Сустракацца яму даводзілася з мноствам людзей. Трапляліся і гаваркія, прыхільнікі вострага слова, і ён нястомна занатоўваў трапныя і дасціпныя словы, словазлучэнні, прыказкі і прымаўкі, дыялогі, цікавыя гісторыі і зберагаў іх. У руплівага збіральніка народных скарбаў паступова назапашвалася багата каштоўных матэрыялаў, занатовак. Аднаго разу прафесар расказаў мне, як на Лагойшчыне, ідучы ў разведку ў час блакады ўвесну 1944 года, ён закапаў на палянцы між хвоек старонкі дзённіка і першы агульны сшытак народных выслоўяў і як мірным часам не раз ездзіў у тую мясціну, шукаў схаваны скарб, ды адшукаць не ўдалося.

Калісьці ў маладосці Фёдар Янкоўскі вызначыў свой жыццёвы арыенцір: «А ці ж акрэсліў, як далей ісці? Акрэсліў. Цвёрда і назаўсёды: на світанні ці на змярканні, золкаю ці ведранаю ноччу, хмурым ці сонечным днём — заўсёды і ўсюды жыццё маё будзе не дзеля кавалка хлеба; найгалоўнейшае, ад чаго не адступлюся, хоць апынуся ці ў акопах, ці ў шпіталі, хоць буду халодны і галодны, — маё роднае слова, родная натура вялікага краю, родная Беларусь. Вы — мая радасць і ўцеха, вы — мая скруха і боль, вы — маё шчасце, жыццё».

Як бачым, не адступіўся Янкоўскі ад галоўнай жыццёвай лініі, хоць зведаў пекла дзвюх войнаў, холад і голад, раненні і шпіталі, балючыя страты родных ды блізкіх. Беларускі характар выстаяў. Рукі ў чалавека не апусціліся, любоў да жыцця, да людзей і прага тварыць не зменшыліся. Сэрцам адданы роднаму слову не здрадзіў яму. Яго адданасць любімай справе, шчыраванне на грунце высокай адукацыі і культуры аказалася магутным рухавіком плённай навукова-творчай дзейнасці. Трыадзінства вучонага, пісьменніка і педагога сталася гарманічным і паспрыяла стварэнню жыццядайнае навуковай і літаратурнай спадчыны.

...Аднойчы з прыемнасцю даведаўся ў рэдакцыі «Народнай волі», што ласкавая гаспадыня рэдакцыйнай прыёмнай Ніна Міхайлаўна Лявончык (дзявочае прозвішча Пакладок) была студэнткаю Фёдара Янкоўскага. У Менскім педінстытуце ён выкладаў даволі складаную навуку — гістарычную граматыку беларускае мовы, і студэнтка Ніна Пакладок слухала яго лекцыі. Я запытаўся, якое было ў яе ўражанне ад неардынарнага выкладчыка, яго лекцый, ад першае сустрэчы з ім. Ясныя вочы Ніны Міхайлаўны, здавалася, яшчэ больш пасвятлелі, засвяціліся душэўным святлом. Адчувалася — гэта быў любімы выкладчык. Субяседніца пачала з таго, як ён выглядаў вонкава: невысокага росту, з чорнымі, як смоль, валасамі, густымі чорнымі бровамі. І з ямачкай на бародцы. З гладка зачасанага валосся адна пасмачка ў яго непакорна выбівалася наперад, і ён двума пальцамі левай рукі закідаў гэтую сярэдзінку чуба дагары; пад правай рукою, калі ішоў на заняткі ды з заняткаў, звычайна трымаў папачку з патрэбнымі матэрыяламі. Хадзіў павольна, трошкі нахілены ўперад.

Я не мог не пацікавіцца, як чытаў Янкоўскі лекцыі і які ён быў экзаменатар.

— Не чытаў ён, а прамаўляў, — сказала Ніна Міхайлаўна. — І такая стаяла цішыня, што калі б муха праляцела, было б чутно. Гэта быў чарадзей слова, майстар, умеў выкласці тое, чым дасканала валодаў. Студэнты вельмі паважалі і любілі Фёдара Міхайлавіча. І пабойваліся. Быў ён патрабавальны, любіў дакладнасць, дысцыпліну, парадак.

«Слова яго, шчырасць яго, вернасць яго можна браць у дарогу, як спрадвеку бярэцца хлеб». Так пранікнёна сказаў народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль пра вучонага-мовазнаўцу і празаіка Фёдара Янкоўскага.

У кнізе «Моўныя адзінкі і кантэкст» (1992), прысвечанай светлай памяці Настаўніка — прафесара Ф. М. Янкоўскага, ёсць артыкул Г. М. Малажай «Руплівы даследчык і выдатны педагог» з такімі радкамі: «Ф. М. Янкоўскі не быў кабінетным вучоным. Ён кожны дзень быў на людзях, з людзьмі, нават тады, калі дактары настойліва рэкамендавалі яму адпачыць ад «усяго». Але гэтае «ўсё» для Фёдара Міхайлавіча было яго жыццём, а ад яго «адпачыць» нельга». Вось якраз тая акалічнасць, што ён быў на людзях, з людзьмі, давала яму і безліч нявыдуманых герояў ды непрыдуманых сюжэтаў для мастацкіх твораў. У яго ных апавяданнях-мініяцюрах, абразках, эсэ, нарысах, эцюдах так шмат рэальнага жыцця, народнага характару, захапленняў і расчараванняў, радасці і болю. І скрозь аўтар выглядае арыгінальным, абсалютна непаўторным творцам, з яго бясконцымі моўнымі залацінкамі, адкрыццямі, а галоўнае — з яго ўменнем падачы хвалюючых падзеяў, здарэнняў, фактаў. Пабач з людзьмі, прыгожымі душою, ён паказвае пустадомкаў, гнюсату, нелюдзяў. У кожным такім выразе чытаецца трапная характарыстыка. А з безлічы змястоўных прыказак і прымавак, ім сабраных у народзе, назаву хоць бы дзве, якія ніколі не страцяць актуальнасці: «Для халуя і ката адна падрыхтавана плата», «Адною рукою дае, а дзвюма адбірае».

Не магу не падкрэсліць істотную рысу Янкоўскага: яго чалавекалюбства. Некалі ён занатаваў у сваім Глускім раёне пачутае: «Без людзей ні нараджацца, ні будавацца, ні паміраць». Гэтак проста і праўдзіва! Адзін з раздзелаў кнігі «Радасць і боль» (1995), перавыдадзенай ягонымі жонкай і дачкой, называецца: «Дарагія мае простыя людзі. Добра з вамі». Чытаю-перачытваю абразок «І за гарою пакланюся», перанесены з аднайменнае кнігі ў гэтае новае выданне. Цёпла на душы ад чалавечае дабрыні, увагі і людской удзячнасці. Гісторыя як бы вельмі простая. Ад Карэліч пад Нёман на легкавічку ехалі мужчыны — аўтар і яго сябра. Спыніла іх нечаканае: «На траве пры дарозе хлопчык. Ці то сядзіць, згорбіўшыся, ці то ляжыць. Каля дзіцяці — не ў руках — вудка, побач — торбачка. Спыніліся, пагледзелі. Хворае, стагнала. Ручка на жывоціку. Калі неслі ў машыну, толькі нібы паказала, куды везці». І далей: «Сустрэла нас маці. Узяла з рук дзесяцігодачка. Стрымліваючы слёзы, сказала: — Я й за гарою вам пакланюся. Які вам дзякуй! Вялікі вам дзякуй, людцы». Вярталіся мужчыны з нёманскіх берагоў праз чатыры дні. Завіталі ў двор, куды прывезлі таго рыбачка. Маці пазнала іх і клікнула з хаты Алеська, паказаць яго... Запрашала ў хату, у сад. А калі сядалі ў машыну, сказала зноў тое матчынае, шчырае, тое народнае, незабыўнае:

— Я й за гарою вам пакланюся.

Дадала:

— Гладкае вам дарогі.

А першая кніга мастацкай прозы Янкоўскага пачынаецца апавяданнем «Цёзка» — пра былога панскага парабка, кавалерыстнага вусатага вясковага чалавека, з якім аўтар знаўся ў час ваеннага ліхалецця і які аднойчы памог разведцы. Дарэчы, калі ён даведаўся, што камандзір яшчэ і настаўнік, з таго дня ні разу не сказаў яму «ты». Фёдар Міхайлавіч сустракаўся з ім і пасля вайны. А ў снежні 1950-га аднаго разу, калі выкладчык выйшаў з аўдыторыі, яму сказалі: «Вас каля прафесарскай чакаюць». Так, там у натоўпе студэнтаў стаяў стары чалавек у доўгім кажусе, падперазаным шырокім саматканым поясам, з шапкаю пад пахаю і з доўгім ядлоўцавым пугаўём, на якім вісела чорная і на вузельчыках пуга. Барада была ўжо не рыжаватая — пабялела, вусы, як звычайна ўзімку, прыкметна пасекліся, парадзелі і паменшалі. Гэта быў пастарэлы цёзка Янкоўскага. Парукаўся ён, палез за пазуху і працягнуў капшук махоркі... Зазвінеў званок на лекцыю, і выкладчык папрасіў, каб дзед пачакаў толькі 50 хвілінак, а тады пагасцюе ў яго дома. А ён падвёў да вакна і паказаў: на двары інстытута, пад высокім гмахам, стаяла фурманка, чакаў нераспрэжаны конь.

— Не. Пабачыў во, што ў паны берацёся і чалавекам астаяцёся, дый патрухаю сабе на ноч гледзячы. Пакуль даехаў, пакуль знайшоў, пакуль дачакаўся — во і сцямнела. Ехаць.

Сустракаюцца ў творах Фёдара Янкоўскага і людзі знакамітыя. Не можа не ўразіць ягонае ўспрыманне легендарнага Рыгора Шырмы. Ужо самы пачатак апавядання палоніць і не адпускае, хоць карыстаецца аўтар звычайнаю моваю. За моўнаю прастатою бачыцца незвычайная ашчаднасць слова:

«Жалобны — на ўсёй Беларусі — дзень: не стала Якуба Коласа.

Я сустрэў Рыгора Шырму. Былі толькі два Шырмавы словы:

— Мы — асірацелі...

Сказаў, і сцяліся вусны. Ні слоў, ні пытання, ні ўздыхання.

Дарагі наш голубе Рыгор Шырма двума слоўцамі, толькі двума, усё сказаў: і хто нам Якуб Колас, і што ўсім нам, самому Рыгору Шырму, Коласава творчасць, Коласава дбайнасць, Коласава сіла.

Вялікі — пра вялікага».

Далей — самае істотнае. Пра Шырму, бліскучага прамоўцу ў паўнюткай інстытуцкай зале: яблыку няма куды ўпасці, пра каго б ці пра што б ні ішла гаворка — пра акадэміка Браніслава Тарашкевіча ці пра беларускую народную песню: «Аднолькава наструнена слухалі Рыгора Шырму і студэнты, і пяць дзясяткаў выкладчыкаў...» І яшчэ — пра тое, які непаўторны ўрок роднага слова праводзіў славуты народны артыст, як браў у рукі розныя кніжкі і зачытваў перад мноствам слухачоў недарэчныя выразы ў апрацаваных народных казках...

У 1977 годзе Фёдар Янкоўскі прывітаў народнага пісьменніка Янку Брыля публікацыяй: «Ідзе хораша, сумленна, смела». Ён, Фёдар Міхайлавіч, так умее нязмушана, натуральна, так хораша распавесці пра асобу творцы, заўважыць тое, чаго не заўважае ніхто. Калі мовазнаўца гаворыць пра ўзоры сучаснай беларускай літаратурнае мовы празаіка — гэта і не дзіва, але калі ён паказвае напоўніцу, што за чалавек гэты народны пісьменнік, які ён надзейны сябра і чым яшчэ валодае, апроч таленту празаіка, — гэта прыемна здзіўляе. Аказваецца, Брыль меў фенаменальную памяць. «Я не раз чуў, слухаў Брылёва чытанне — без тэксту ў руцэ — Л. Талстога, А Чэхава, М. Горкага, «Біблії», А. Міцкевіча, М. Прышвіна... — піша Ф. Янкоўскі. — Веданне моў? Выдатна — рускую, польскую, украінскую, някепска — нямецкую, латынь, стараславянскую...»

А як прыгожа Фёдар Янкоўскі віншаваў юбіляра ў згаданай вышэй публікацыі: «Янку Брылю шэсцьдзясят. Якраз у жніўні. Няхай яму, дарагому Янку Брылю, будзе яшчэ многа жніва. Няхай яго будучыя жніўні будуць нажонныя і ўмалотныя.

А жнівень — і сяўба. І не чаго-небудзь, а самога Хлеба». Мудра. Глыбока. І непаўторна.

У свой час у маёй свядомасці дзейнасць Фёдара Янкоўскага асацыявалася гэтаксама з сяўбою і жнівом. Тады і з'явіўся такі верш:

Будуць будні і святы ЖНІВА

Светлай памяці Ф. Янкоўскага

Гаспадар быў цудоўны —
і справу вяршыў:
шчыраваў на палетках
багатай душы.
Быў ён сейбіт, які забываў
пра сябе,
так аддадзены ўвесь
запаветнай сяўбе!
Пра сваю Беларусь, мову родную
дбаў,
ліст апошні пакуль на зямлю
не апаў.
Заклапочаны, і не заўважыў, калі
ўдалячынь чарадой
праплылі жураўлі.
Спрацаваны, збалелы, пайшоў
на спачын...
К сэрцу вобраз яго прыхінем,
памаўчым.
А наперадзе — будні і святы
ЖНІВА,
з адчуваннем прасторы яго,
харавства.
І наперадзе — сейбіту нізкі паклон
за натхнёную працу,
за дзейнасці плён.

Васіль Жуковіч

«У прасторы міласэрнасці...»: Данута Бічэль пра Ніну Мацяш

— Данута Янаўна, у Вашым эсэ пра Ніну Мацяш ёсць такое выказванне: «Дзяўчаты, якія нарадзіліся невылечна хворымі, жывуць як святыя»... Генадзь Праневіч, разважаючы пра постаць Ніны Мацяш, выказаў думку, што Ніна Мацяш вартая прылічэння да ліку святых... Сваіх сябровак — Ніну Мацяш і Ларысу Геніюш — Вы называеце святымі...

— Гэта толькі наша прыватная думка, можна сказаць, мастацкі вобраз. Увогуле, лепей пражыць жыццё як у вершы Максіма Танка: «Простае шчасце людское»... А крыху грэшнае жыццё — дык яшчэ цікавейшае. Калі сёння пра ўсё гэта думаць, то я перакананая, што самае лепшае жыццё пражылі нашы мамы і таты, нягледзячы на войны, голад, хваробы і смерць. Гэта жыццё, пражытае ў тым месцы, у якое іх праслаў Бог, у сваім часе, на сваёй зямлі. Усе памылкі нашых бацькоў, грахі, крыўды, па-чалавечы можна зразумець і апраўдаць розумам перад Богам і перад намі, іх дзецьмі, і перад Беларуссю. Калі і Ніна вярнулася дадому, калі захварэла...

— «Ніна была паэткай болю» — так вызначылі Вы сутнасць яе паэзіі...

— Ёй балела, а яна не паказвала выгляду перад людскімі вачамі, а таму і трывала, што мела куды выліць боль: у слова, у вершы, у пераклады. У Ніных вершах можна панавыбіраць шмат радкоў пра боль і цэлыя паэмы... «Лёс мой, цяжкі камень»... Мы і не ўяўляем, які боль цярпела Ніна. Магчыма, Ніна і паэткай стала таму, што насіла гэту родавую хваробу. Прывязаная да каляскі, шмат чытала. Нехта з крытыкаў, здаецца, Бярозкін, заўважыў, што Ніна прыйшла ў літаратуру ад кнігі. Кнігі былі трамплінам, Ніна вучылася ў паэтаў свету, чытаючы іх і перакладаючы, перастрараючы на беларускую мову. Калі я першы раз трапіла ў яе кватэру, я была здзіўлена, колькі паэтаў свету ёсць у яе бібліятэцы, пра якіх я нават не чула. Ніна Мацяш выхоўвала, узмацняла, узбагачала сваю песню — і да апошніх вершаў яна дайшла вельмі адметнай, незалежнай, далікатнай і магутнай паэткай.

У яе не было комплексу правінцыялкі. Я толькі збоку назірала, як яна смела выступала на літаратурных сустрэчах у Доме літаратара «пры каміне», з адпаведным паўзмрокам, дзе натоўп быў як бы адмежаваны ад паэткі, яна сабе гаварыла і чытала свае вершы, а сталічныя жанчыны плакалі наўзрыд. А яна як і не чула іх. Яна магла спяваць паміж чытаннем вершаў — без акампанемента. Неяк яна прадумвала ўвесь свой рэпертуар, а выглядала гэта як экспромт, і не збівалася, і не стамлялася, не камячыла, не разбурала той гармоніі свайго выступу, якую перад гэтым прадумала...

«Паэтка болю» была прыкладам трывання. Але не будзем яе выносіць на алтар царкоўных святых, хоць бы і таму, што Беларусь падзелена на канфесіі, якія часцяком паміж сабой не сябруюць, а нашы паэты і паэткі сябравалі ўсе з усімі, нам пры саветах трэба было трымацца, каб не пераламалі нас паасобку, па адным, як дубцы з веніка, зрэшты, некага выцягвалі з таго «веніка» і ўсё роўна ламалі, але большасць утрымаліся за Танка, за Брыля, за Калесніка і за Ніну Мацяш... А гэтая еднасць і была нашым шчасцем.

— Вы сказалі, што праца Ніных рук — «варыць ежу, лупіць бульбу, каб пальцы не мярцвелі, увесь час імі варушыць, перабіраць, плесці з нітак, укладаць перыйкі, лісткі, карэньчыкі, пялёсткі» — гэта «маўклівыя вершы болю»...

— І галоўнае, запаўняць сваю балесную адзіноту, ёй, якая пражыла больш жыцця прымацаванай да каляскі, да



Ніна Мацяш

крэсла, да ложка. Я часта думаю пра гэта, калі мне баліць цела: як яна ўсю ноч не варочаецца, адна ў кватэры... Але яна мяне навучыла, як суцішваць боль у целе. Я і цяпер, бывае, угаворваю старэчае хворае цела, тую кропку болю, засяроджваючы на ёй сваю ўвагу. Магчыма, гэта ад ёгі... Я не ведаю — хто навучыў Ніну, ці яна сама такі спосаб прыдумала. А яе мастацтва... Думаю, і гэта ад таленту. Калі б яна была здаровай, яна б таксама займалася і пляценнем, і вязаннем, і вышываннем. І складаннем музыкі, і спевам. Таленавітая была ад прыроды.

— «Мела духоўныя сілы перасесці з каляскі ў крэсла паміж Ларысай Геніюш і Валодзем Калеснікам, каб яны маглі паразмаўляць праз яе хворыя плечы»; «Ніна сядала там, дзе паміж імі праходзіла лінія фронту».

— Валодзя Калеснік быў салдатам, ваяваў з фашыстамі са зброяй у руках, хто першы стрэліць, той застанецца, іншых адносінаў з ворагам Валодзя не ведаў... Эмігрантам прыходзілася ўступаць з немцамі ў перамовы, шукаць нейкія іншыя варыянты змагання... Я напісала гэта, як радок да верша, але сёння растлумачыць гэтую думку мне цяжка.

— «У кожнага з нас маецца свой алфавіт, каб стварыць паэзію», — пісала Вам пані Ніна ў лісце. Што гэта за такі «паэтычны алфавіт»?

— Натуральна, што гэта ўсе спосабы і мастацкія формы, якімі карыстаюцца паэты, каб дасягнуць патрэбнага кшталту. І тое, што ёсць у нашым распараджэнні падсвядома. Як ёсць алфавіт, то ёсць і слоўнікавы запас. У Ніны, да ўсяго, было ўменне з родных словаў ствараць яшчэ раднейшыя, свае, прыдуманыя. Ды вы, яе сяброўкі, ёй дапамагалі, у вас была такая гульня — размаўляць на мове Ніны Мацяш... Па-мойму, вы збіраецеся выдаць слоўнік мовы Ніны Мацяш, але трымаеце гэта ў сакрэце. Відаць, ваш алфавіт таксама мае свае таямніцы і, магчыма, магію, чары-мары, адкуль мне ведаць. Тут Віслава Шымборска, якую Ніна таму так добра і пераклала, што ў іх абедзвюх было гэтае ўменне ствараць свае словы, сказала б болей за мяне. Мова Ніваў — Ніўкаў і Белаазёрска мае шмат асаблівасцяў, і Ніна імі карысталася. Я таксама далёка не ўцякала ад мовы сваёй вёскі, ад мамінай мовы. Быў час, калі ўсе захапіліся слоўнікам Ластоўскага. Да мяне гэтае захапленне пранікла ў кніжачку «А на Палессі»... Тарашкевіца мне аказалася не па зубах.

— Так, сапраўды, пані Ніна ахвотна карысталася новымі словамі, і сама не баялася тварыць на аснове добра вядомых. Слоўнік такіх «самацветаў» багаты, добра было б яго выдаць, каб паказаць і багацце нашай мовы, і творчую стваральную працу пані Ніны... Вы прысвяцілі Ніне Мацяш некалькі вершаў. Там ёсць Белае і Чорнае возера, белыя і чорныя чайкі...

— А хіба ў прыродзе няма чорных чаек? Бо Чорнае возера ёсць, Ніна мне яго і паказвала. Яно, дарэчы, нават цікавейшае, чым Белае, бо пасярэдзіне возера шмат усяго — чароту, астравоў... Рыбакі там свае схоўкі ставяць... А жыццё наша гэтак жа, як азёры, — то белая паласа, то чорная... А ў некага ў жыцці толькі адзін колер. Але Ніна ўсю чарнату забельвала сваёй дабрынёй да людзей, і столькі яе ў душы мела, з усімі дзялілася і нікому не бракавала.

— У эсэ Вы прыгадваеце радкі з ліста, дзе пані Ніна расказвае сон, які прысніўся ёй перад адыходам у іншы свет. Ці прадчувалі Вы, што гэта перад Ніным адлётам?

— Не было ніякага прадчування, ніякай трывогі... І калі яна ў трубку тэлефона гаварыла пра тое, што яна ўжо пойдзе і не трэба яе адгаворваць... Што пара, напакутвалася... Я падумала, што яна прыехала з Брэста, стамілася і ёй холадна і хочацца спаць.

— Вашая «Калыханка Ніне» — гэта такое балеснае паэтычнае галашэнне... Як так напісалася?

— Такія вершы пішуцца экспромтам — з любові, з адчаю. Уся добрая паэзія ствараецца так — сэрцам. Мне Ніна была патрэбная. Чаму — была?! І цяпер яна ёсць. Толькі не патэлефануе і не скажа: «Алёў, Данусенька! Як ты там, сястрыца?» Ды гэты верш лёгка склаўся, бо створаны як галашэнне, як плач.

— Ніна любіла кветкі. Любіла, каб было прыгожа ў гарадскім дворыку. Прасіла саджаць шыпшыну-ружу, мальвы... І сама была то ружаю, то мальваю... З якімі кветкамі помніцца Вам яна?

— З кактусам. Таму што ёй было гэтак хадзіць па паркеце, як па кактусах. У яе кактусы стаялі на вокнах, цвілі... Хто верыць у прыкметы, той не трымае дома кактусы, а Ніна іх збірала ў калекцыю.

— Апошні зборнік, які пані Ніна ўкладала сама, назвала «У прыгаршчах ветру». Радок з верша пра лёгкую пярынку дзьмухаўца... Уражанне, што кожным сваім чарговым зборнікам яна развітвалася з гэтым белым светам, са сваімі чытачамі...

— Так. Кожны пражыты Нінай дзень даваўся ёй надта цяжка, але як яна адчувала хвіліны шчасця, як яна іх высока цаніла, упрыгожвала паэтычнымі вобразамі: «Два дні і ночы праляцелі, як дзве пчолкі...». І як яна змагала выкарыстаць і сваю адзіноту, і хваробу, запоўніць любоўю, пошукамі вобразаў, працай. Ёй нельга было сварыцца з людзьмі, іх крыўдзіць, бо яна была на іх руках... І гэта было цяжкае выпрабаванне, якім нельга было падзяліцца ні з кім...

— У архіве Ніны Мацяш захоўваецца такая прыгожая самаробная Вашая паштоўка: паэтычнае велікоднае яйка. Гэта такі своеасаблівы твор паэтаграфікі...

— З лацінскіх паэтаў, здаецца, Вісэнты Уі добра маляваў свае вершы, укладваў радкі ў графічныя фігуры, і, чытаючы іх перад слухачамі, заадно рабіў такія мінівыставы. Зрэшты, Ніна гэта рабіла яшчэ больш «крута» — укладаючы сваю пёркаграфіку. Я толькі гэтае яечка і намалявала — у яйку дрэва, на якім растуць вершы. У кнізе «Хадзі на мой голас» — на вокладцы хатка з карціны Вікторыі Ільіной, а сярод фатаграфій — гэтае яечка з яблынькай, на якой спеюць вершы, і хатка, што паляцела з дымам. Ёсць у маёй празаічнай кнізе і эсэ пра паэтак «Яблынькі»... Калі я малявала для кнігі, я рабіла шмат варыянтаў, бо такі з мяне мастак... Шукала дасканалы варыянт, астатнія раздавала сяброўкам. Верш з яйка я нядаўна перапісала ў слупок, і вось што атрымалася... І паколькі мы нашы размовы прывыклі заканчваць нейкай вершаванкай, то і гэтую так скончым.

Світанак

Світанак пасля начных прыгнятанак...
Світанак глыбокіх сэрцавых ранак...
Світанак перад адлётам прыстанак...
Світанак на цёплых зёлках палянак...
Світанак у трох куточках альтанак...

А хмаркі плывуць нацянькі,
нібы мосцікі ўдоўж ракі.
На дваістым дне той ракі
рак палюе, вялізны такі.

А на мосцік драўляны ўдоўж
прысмактаўся той слізкі смоўж.
Паслізнешся, нібы няўзнак —
будзеш там, дзе зімуе рак.

Я не плачу аб слове памерлым,
я на полымі скамянелым
малюю сцяжок белым мелам.

А нехта маўчыць за сталом,
пад скамянелым крылом
гартае страт важкі том...

А на яблыні зоркі расіцу п'юць,
зялёным яблыкам заядуць,
напіўшыся, у хмаркі свае палятуць.

Жаўранак будзіць дасвецце,
з хмаркі страсае вецер,
расцвітае акна ружы-квет,
усміхаецца ўвесь белы свет!

Вядзёрка ў студню дае нырца,
падстаў збаночак — нальe жыцця.

Завуркоча ў коміне гром,
Дух Святы прыходзіць з дажджом.
Боажанька вітае дабром,
дабрынёй напаўняе дом
і праводзіць з поўным вядром.

— Ведаю, што Вы напісалі новыя вершы... Ёсць сярод іх і верш пра пані Ніну.

— Так, думаю пра Ніну і гавару з ёю...

Ніна Мацяш

У Ніўках нарадзілася Нінка,
з нябёсаў дажджынка...
Найсвяцейшай Панны пярлінка...
Укрыжаванага Збаўцы слязінка...
Ерузалемскай пальмы галінка...
Вербнай нядзелі вярбінка...
Не адна балеснага шчасця хвілінка...

З белай хмары ў белыя хвалі
Бог адпускае Анёлаў-дзяўчат,
каб белыя хвалі іх калыхалі,
як бязгрэшных святых немаўлят,
каб іх ножанькі не таптаілі
пчолак, коцікаў, птушанят,
каб не спаўняў над імі загад
сучасны Понцій Пілат...

Птахі на крылах іх уздымалі,
каб святлеў ад крыл далягляд...
раны духовыя ім бінтавалі,
да святасці ў райскі сад!
Хлопцы, узмоцненыя духова,
каб насілі іх на руках...
так адгаўлялі родныя словы
чыстыя сэрцы ў дзявочых грудзях!

Бог забраў Ніну ў сваю Краіну.
Беларусь мае паэтку Ніну —
не на хвіліну, часу ў нас шмат!

26 жніўня 2018

Гутарыла Марыя Новік

Боль і час



Вольга МІКАЛАЙЧЫК

***

пафарбую валасы
ад спрадвечнае сівізны
расою
крывёю
ладанам
яблыкам пáданым
мараю
хмараю
кáраю
людскім праклёнам
ды сокам з клёну
ільном
ды сном
хмельнай закваскаю
Божаю ласкаю
валасы распалю
грабенчыкам прыхаплю
выйду ў людзі —
ніхто не забудзецца

***

Мой ненароджаны сын
Уночы прыйшоў, як заўжды
Зноўку з маёю дачкою — тою
Што не нарадзілі з табою
Шалёнай парою ў мрою

Калі не глядзіш на гадзіннік
Вечнасці
А ён бязлітасны
Ў сваёй бесчалавечнасці.

Нашыя дзеці — ужо толькі мары
Зноў пасвяцілі нам з Неба праз хмары
сваімі анёлавымі бліскавіцамі —
клічуць за іх памаліцца
Яны трымаюць ліхтарыкі ў рукавічках
якія на кросенках колавароту
выткалі райскія нянькі з нітачак,
звітых з праменчыкаў нашых знічак.

Дзяцей прывялі на спатканне Дзяды
Таксама ў наш горад — да нас сюды
Пасталі яны па-над нашай бядою,
над пакаяльнаю хадою
над дрэвамі ды над вадою
над мокрым снегам
ды над ветрам,
над нашым сцягам
ды над дымам
над нашым домам,
якім стаў намёт ды намолены плот.

...Святло паўстала там
Над пляцам гора
дзе лес і лёс,
і Біблія і Тора.

Праз памяць,
праз малітву пакаяння
Больш не абудзецца
Ніколі развітання.
Пад вартаю Бога
З'явілася дарога



Фота www.de.wikiloc.com

І цені знікаюць
І Дзеці з Дзядамі
На нашыя спевы чакаюць...

Малітваю ціха па Небе
Ільецца размова між намі і тымі
Каго на зямлі ўзгадаюць...

***

Не будзь са мною ў горы
Калі не быў у радасці
Не зыч мне шчасця
Якое не спраўдзіцца
Не спрачайся не дапаможа
Госпаду не да таго
Прытулі галаву да малітвы
Сцежкаю ціха праводзь таго
Хто ціха свой дзень пранёс

Праз
Няспраўджаныя мары
Ды непрынятыя ахвяры
Свой боль і свой час
Пакуль Госпаду не да нас
Бо
Не падзеліш калі няма чаго
Не надзеліш калі няма каго
Не пасумуеш калі няма па кім
Не выплачаш калі ніхто не пакінуў

Акрэсцінская лічылка-страшылка

Сядзелі мы лоўка
з пятлёю на галоўках
ручкі за спінку
ножкі ў наколках
Божая кароўка
паляці на Небка
дам табе хлебка
з турэмнай сталоўкі
Патачу пазногці
аб белую сцену
Намалюю косьці
Замоўлю кагосьці
Сяду ў самалёт
палячу за дрот
Лягу-прылягу
сню кáта-бедалагу —
ляжыць у труне...
Не сніся болей мне!

***

не пілуй мой крыж
не глядзі ў мой лёс
не бяры таго
што не сам прынёс
не хавайся там
дзе не намаліў
не насі свой бруд
дзе святы хадзіў

Слова першае



Вадзім КОРАНЬ

***

На пачатку было Слова.
Усе гэта ведаюць. Нічога новага.
Але ж якое Слова на пачатку было,
калі сонца ў небе ўпершыню ўзышло?
Цяпер мы ведаем шмат словаў:
можам па-англійску,
па-нямецку,
а нехта і на эльфійскай мове.
Хтосьці нават прыдумаў бальбуту,
якую я не ведаю, але гучыць крута.
Ды няважна гэта, другасна, неістотна,
бо нават з мовай кожны з нас самотны,
калі не ведае Слова,
што было на пачатку,
якое нехта Невядомы напісаў асадкай
на сэрцы кожнага,
хто прыходзіць у гэты свет,
толькі камусьці яно вядомае,
а для кагосьці — сакрэт.
Яно нябачна выбіта на дзвярах
кожнага храма:
«МАМА».
Яно на ўсмешлівых вуснах кожнага дзіцяці
і стогадовага старога ў бацькоўскай хаце,
які самотна памірае
і чакае,
што калі адчыняць райскую браму,
ён убачыць і абдыме маму...

На пачатку было Слова...
І Слова першае самае —
«МАМА»...

***

Заблудзіўся ў жыцці, навакол цішыня,
няма сілы змагацца і нешта змяняць.
Бачу Бога, але нехта выключыў гук,
цела быццам аплёў павуціннем павук.

І гадзіннік зламаўся, час раптоўна памёр,
нам пакінуўшы сумных імгненняў узор.
У руку — па цвіку, і ўжо не паляціш,
адчуваючы целам няструганы крыж.

Спадзяванні на літасць зніклі
ў жудасным сне
ні святла, ні надзей не пакінуўшы мне.
Толькі шрам на вуснах, слёзы ўжо не стрымаць —
страшна думаць пра Неба, калі ў сэрцы зіма.

Папяровыя ружы замест кветак жывых.
Мару Бога пачуць і напружваю слых.
Чую — плачуць анёлы за чорнай гарой
словы песні маркотнай, як поўня, старой.

***

Апошні сон
складаецца па частках.
І з іх
я добра памятаю тры.
У першай
тры анёлы ў страшных масках
спрабуюць непакорлівых скарыць.
Ўсё аплялі яны
калючым дротам,
што цягнецца ажно за небакрай,
забыліся на святасць і на цноту —
без спеху дабудоўваюць свой рай.

Другая —
белы снег да далягляду
і злосная нямая цішыня.
Чакае зграя воўчая загаду,
каб разарваць нявіннае ягня.
А я крычу: «Спыніцеся! Не трэба!»
Спрабую захіліць яго сабой...
Дарэмна... Засталіся толькі неба,
пакуты, ціш і невычэрпны боль.

У трэцяй —
вочы выпалілі зоркі,
калі сачыў прыгожы зарапад,
схаваўшыся на кургане-пагорку,
і стала цемра страшная па-над
зямлёй. І сцежку, што расой блішчала,
не мог убачыць і не мог знайсці.
Сляпую цемру, што наўкол паўстала
нат з сонцам немагчыма перайсці.

Наступную я не магу ўжо ўспомніць.
Так хочацца, каб там было святло.
Няхай не сонца, хай самотнай поўні,
але каб толькі там яно было.

Апошні сон складаю я па частках.
Не склеіць іх,
не сшыць
і не звязаць.
На чалавека Бог паставіў пастку:
час знікне і не вернецца назад.
А разам з часам знікнуць
успаміны
пра шчасце,
пра сяброўства,
пра любоў...
І сыплюцца пясчынкамі хвіліны
ў гадзінніку,
які не бачыць сноў.

***

Казка заўсёды толькі казкаю застаецца
і што там усё добра нам толькі здаецца.
Чырвоны Каптурок ужо не тая,
што раней:
пасталела і перабралася ў горад —
там зручней,
больш сродкаў і магчымасцяў
зрабіць кар'еру,
хоць спачатку ўладкавалася
звычайным кур'ерам.
Стамлялася на працы.
Сустракалася з дрывасекам,
які спрабаваў зацягнуць яе ў секту,
і яшчэ не вядома, што б з ёю сталася,
калі б збегчы адтуль не атрымалася.
Пасля сустракалася з добрым хлопцам,
але праз паўгода ён пачаў калоцца,
а потым узяў і выйшаў з кватэры,
толькі пераблытаў акно і дзверы.
Потым сама яна нешта прымала,
бо было балюча — яна ж кахала...
Маці знайшла старога багатага прынца
і павандравала па еўрапейскіх сталіцах.
Яна сабралася хутка,
ажно забыўшыся развітацца,
сказала толькі:
«Трэба й сабою заняцца!»
Бабулю падманулі:
яна ўсё, што было, аддала пад заклад,
бо ёй паабяцалі новы дом і вялікі сад.
Аддала нават сваю дыядэму срэбраную —
узнагароду на даўнім конкурсе прыгажосці.
Жыла ў доме састарэлых
нікому непатрэбная
і ўсё чакала, што да яе
прыедуць госці.
Не прыехаў ніхто.
І памерла, пакінутая ўсімі:
унучцы пляваць, а дачка з кавалерам —
у Рыме.
Што казаць, іх нават не было
на пахаванні,
якое прайшло без слёз
і ў сумным маўчанні.

Але ж усё магло быць і зусім іначай...
Ну, што ж, гэта на дзіва простая задача.
Возьмем кніжку, адгартаем назад,
бы плёнку ў кіно:
дзяўчынка праз змрочны лес
бяжыць з усіх ног
да любімай бабулі, нягледзячы на страх,
і лёс гэтай дзяўчынкі —
ва ўласных яе руках...

***

Штодзень дадаю ў верш слова.
Штораз верш становіцца
большым на слова.
Аднойчы ён набудзе форму,
знерухомее
і завершыцца.
Але я,
паставіўшы кропку
ў канцы апошняга радка,
ані прачытаць
яго ад пачатку
не змагу,
ані паправіць.
Так і пішу —
чыставік.

Уладзімір АРЛОЎ

«Воля, вернасць,

Рыхтуецца да друку другая частка кнігі «Айчына. Маляўнічая гісторыя». У першай частцы пісьменнік Уладзімір Арлоў і мастак Павел Татарнікаў распавялі чытачам пра падзеі і выдатных асобаў нашай мінуўшчыны ад часоў Рагвалода і Рагнеды да паўстання Тадэвуша Касцюшкі (некаторыя старонкі кнігі друкаваліся і ў «Новым часе»). Храналагічныя межы новага выдання, таксама адрасаванага найперш дзецям і падлеткам, — усё XIX стагоддзе. Прапануем вашай увазе апавяданні з будучай кнігі.

МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ

Кожны з вас чуў незабыўную, узнёслую і напоўненую светлай тугой мелодыю паланеза «Развітанне з Айчынай», якую звычайна называюць проста паланезам Агінскага. Кампазітар, які напісаў гэты сусветна вядомы твор, паходзіў з роду, што даў Літве-Беларусі шмат выдатных людзей: дзяржаўных дзеячаў, ваяводаў, пісьменнікаў і кампазітараў. Самым знакамітым наканавана было стаць графу Міхалу Клеафасу Агінскаму — дыпламату, палітыку, паўстанцкаму правадыру і таленавітаму творцу.

«Воля, вернасць, незалежнасць»

Агінскі ўжо ў юнацтве быў абраны дэпутатам Сойму, праславіўся як таленавіты дыпламат, а ў дваццаць восем гадоў заняў у краіне нашых продкаў адну з найвышэйшых дзяржаўных пасадаў. Яго прызначылі падскарбіем — міністрам фінансаў Вялікага Княства Літоўскага.

Калі ўспыхнула паўстанне на чале з Тадэвушам Касцюшкам, Міхал Клеафас адмовіўся ад міністэрскай пасады і ахвяраваў 120 тысяч рублёў на паўстанцкі конны полк. За ўласныя грошы ён таксама стварыў і ўзброіў батальён стральцоў з пяці сотняў паўстанцаў. Родавы герб на сваёй пячатцы Агінскі замяніў на дэвіз «Воля, вернасць, незалежнасць».

Агінскі быў не толькі здольным камандзірам. Ён напісаў «Марш паўстанцаў 1794 года», які спявалі змагары на ўсім абшары Княства.

Ваяры Міхала Клеафаса разграмілі вялікі аддзел царскіх казакоў пад Валожынам, адважна дзейнічалі на Браслаўшчыне і пад Дзвінскам (Дынабургам). Агінскага заўсёды бачылі ў самай гушчыні бою, і ён некалькі разоў толькі дзівам застаўся жывы.

Пасля таго, як царскія карнікі на чале з генераламі Аляксандрам Суворавым задушылі паўстанне, Агінскі мусіў весці жыццё выгнанца ў розных еўрапейскіх краінах.

Паўночныя Афіны

Калі былому паўстанцкаму камандзіру ўдалося вярнуцца з чужыны на радзіму, ён пасяліўся ў маёнтку Залессе пад Смаргонню. Агінскі перарабіў яго ў культурную сталіцу краю. Сучаснікі параўноўвалі Залессе са сталіцай старажытнай Грэцыі, дзе квітнела мастацтва, і захоплена называлі маёнтак графа Міхала «Паўночнымі Афінамі». У палацы Агінскага часта бывалі кампазітары, пісьменнікі і мастакі, прафесары Віленскага ўніверсітэта. У вольны час госці блукалі па вялікім прыгожым парку з аранжэрэямі і мудрагелістымі альтанкамі. Ганаровае месца ў парку займаў валун, пастаўлены ў памяць пра баявых пабрацімаў гаспадара — змагароў Тадэвуша Касцюшкі. Гэты гістарычны камень можна ўбачыць і сёння.

Міхал Клеафас быў добра знаёмы з Адамам Міцкевічам, Тамашом Занам, Аляксандрам Ходзькам ды іншымі сябрамі таемных патрыятычных таварыстваў філаматаў і філарэтаў.

Улюбёным заняткам гаспадара Залесся была музыка. У той час паланезамі, мазуркамі, вальсамі і менуэтамі Агінскага часта распачыналіся балі па ўсёй Еўропе. Творамі нашага суайчынніка захапляліся выдатныя еўрапейскія кампазітары Ёзэф Гайдн і Вольфганг Амадэй Моцарт. Водгукі мелодый Агінскага можна пачуць у творах Ферэнца Ліста і Роберта Шумана.

Мелодыя арыі Фігаро ўпершыню прагучала за восем гадоў да пастаноўкі славутай оперы Моцарта «Вяселле Фігаро» ў адным з музычных твораў графа Агінскага. Уплыў музыкі нашага суайчынніка зведалі таксама славуты паляк Фрэдэрык Шапэн, а таксама расейскія кампазітары Пётр Чайкоўскі і Міхаіл Глінка, які быў беларусам з паходжання.

У Залессі былі напісаны і самы вядомы паланез Міхала Клеафаса, які сёння можна пачуць не толькі ў Беларусі, але ў канцэртных залах Варшавы і Парыжа, Берліна і Прагі, Вены і Венецыі. Па ўсёй Еўропе часта граюць паланез Агінскага і вулічныя музыкі.

Развітанне з Айчынай

Міхал Клеафас Агінскі быў добра знаёмы з царом Аляксандрам I і французскім імператарам Напалеонам. З іх дапамогаю граф-патрыёт спадзяваўся вярнуць Айчыне незалежнасць, але гэтыя мары не спраўдзіліся. Праект аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага, складзены Агінскім разам з аднадумцамі, застаўся нявдзейсненым. Супраць яго выступіла расейскае дваранства, а неўзабаве пачалася вайна 1812 года.

Пазней Агінскі вырашыў назаўсёды пакінуць родныя мясціны. Ён не хацеў жыць у паняволеным расейцамі краі. У Вільні ды па ўсім былым Вялікім Княстве царская жандары арыштоўвалі сяброў і аднадумцаў Міхала Клеафаса. Небяспека навісла і над самім гаспадаром Залесся. Якраз у той трывожны час і быў створаны шчымлівы паланез «Развітанне з Айчынай», у якім адлюстраваліся надзеі і смутак аўтара.

Паданне апавядае, што ў свой апошні дзень у «Паўночных Афінах» Міхал Клеафас сеў за фартэпіяна і напісаў на закапаным слязьмі нотным аркушы музыку, якая зрабіла ягонае імя неўміручым. Потым ён ускочыў у карэту, і толькі тады, калі ад'ехаў вельмі далёка, спахапіўся, што забыў ноты. Але цудоўная мелодыя ўжо ніколі не пакідала памяці кампазітара.

Апошнія гады Агінскі самотна жыў у італьянскім горадзе Фларэнцыі. Ён перагортваў у памяці старонкі свайго багатага на падзеі жыцця і пісаў успаміны. Фларэнтыйцы ўшанавалі выдатнага сына Літвы-Беларусі, пахаваўшы яго ў храме Санта Крочэ побач са знакамітымі італьянцамі: вучоным Галілеа Галілеем, мастаком Мікеланджэла Буанароці і кампазітарам Джаакіна Расіні.

Сёння на фларэнтыйскіх вуліцах падарожнік з Беларусі можа адшукаць дом, дзе завяршыўся зямны шлях Міхала Клеафаса Агінскага. Там усталяваная мемарыяльная дошка з надпісам на беларускай і італьянскай мовах. Копія гэтай дошкі знаходзіцца на будынку музычнай вучэльні імя Агінскага ў блізкім ад Залесся горадзе Маладзечна. Каля вучэльні вас сустрэне бронзавы Міхал Клеафас. Побач з помнікам палітыку, паўстанскаму правадыру і кампазітару ў душы нязменна пачынае гучаць знакаміты паланез.

«Паўночныя Афіны» ў наш час адноўленыя і сустракаюць тысячы турыстаў з розных краін. У землякоў Агінскага і гасцей Залесся вельмі папулярныя балі, якія адбываюцца ў маёнтку некалькі разоў на год. Там можна даведацца пра бальны этыкет, навучыцца выконваць танцы эпохі Міхала Клеафаса, узяць удзел у конкурсах масак і дабрачынных аўкцыёнах. Балі ладзяцца таксама для юных дам і кавалераў.

ПРАФЕСАРЫ БАБРОЎСКІ І ДАНІЛОВІЧ

Царскія ўлады старанна знішчалі памяць пра незалежнае Вялікае Княства Літоўскае. У Расею вывозілі летапісы, гістарычныя дакументы і цэлыя бібліятэкі. Беларусаў хацелі пераканаць, што яны з расейцамі — адзін народ з адзінай гісторыя. Рашуча пярэчылі гэтаму адукаваныя людзі і найперш вядомыя вучоныя.Сярод іх вылучаліся прафесары Віленскага ўніверсітэта Міхал Баброўскі ды Ігнат Даніловіч. Яны казалі ў лекцыях і пісалі ў сваіх кнігах, што беларусы — асобны самастойны народ з найбагацейшай спадчынай. Вучоныя выступалі за аднаўленне Вялікага Княства і за тое, каб беларуская мова зноў была б ім дзяржаўнай. Дзякуючы Баброўскаму з Даніловічам у навуцы ўзнік новы кірунак — беларусазнаўства. Герояў нашага апавядання заслужана лічаць пачынальнікамі беларускага нацыянальнага адраджэння.

Замест вуды — кніга

Малая радзіма Міхала Баброўскага — вёска Вулька недалёка ад Бельска (цяпер яна ў Падляшскім ваяводстве Польшчы). Бацькі і шматлікія сваякі святкавалі нараджэнне хлопчыка ў 1785 годзе. Міхасёў бацька быў беларускім вуніяцкім святаром. Ад яго сын пераняў любасць да кніг і цікавасць да мінуўшчыны роднага краю. У той час, як аднагодкі бавілі вольны час з вудамі на беразе сажалкі, Міхась часта аддаваў перавагу новай кнізе. Хлопчык уладкоўваўся з ёю пад улюбёнай старой грушай каля бацькоўскага дома. Там ніхто не замінаў перагортваць старонку за старонкай і марыць пра будучыя кнігі, якія напіша ён сам.

Начытаны з малых гадоў Міхась добра вучыўся ў царкоўнай школе вёскі Кляшчэлі, а потым у вучэльні манахаў-піяраў у Дарагічыне. Беластоцкую гімназію ён скончыў з срэбным медалём і рэкамендацыяй на далейшае навучанне ў Галоўнай духоўнай семінарыі пры Віленскім універсітэце. Яшчэ семінарыстам Міхал атрымаў навуковую ступень магістра філалогіі, а крыху пазней стаў магістрам багаслоўя і філасофіі.

Неўзабаве малады святар Баброўскі ўжо выкладаў у духоўнай семінарыі і плённа займаўся навукай. Дзеля ўдасканалення ведаў кіраўніцтва Віленскага ўніверсітэта накіравала таленавітага юнака ў падарожжа па навуковых і духоўных цэнтрах Еўропы.

Вена, Рым, Парыж, Супрасль

За час замежнай вандроўкі Баброўскі наведаў Аўстрыю, Італію, Францыю, Нямеччыну... Малады беларус слухаў у замежжы лекцыі знакамітых даследчыкаў у розных галінах навукі, наведваў заняткі ў Сарбонскім універсітэце ў Парыжы. Асабліва грунтоўна Міхал займаўся славянскімі, усходнімі і старажытнымі мовамі, літаратуразнаўствам, гісторыяй і археалогіяй.

Баброўскага можна было сустрэць у бібліятэках Вены і Фларэнцыі, Балоньі ды Парыжа. Пасяліўшыся на нейкі час у Рыме, ён пазнаёміўся са скарбамі мастацкіх і літаратурных калекцый Ватыкана. За навуковае апісанне кніг Ватыканскай бібліятэкі, выдадзеных на кірыліцы і глаголіцы, айцец Міхал заслужыў пахвалу самога папы рымскага. У Венецыі Баброўскі набыў некалькі старадаўніх славянскіх кніг і запачаткаваў сваю бібліятэку кніг па славістыцы і багаслоўю.

Вучоны з Беларусі завітаў на землі невялікага заходнеславянскага народа — лужыцкіх сербаў, а таксама браў удзел у з'ездзе славістаў у харвацкім горадзе Задары. Запрашэнне на з'езд ён атрымаў не выпадкова, бо на той час ужо добра валодаў харвацкай мовай, быў



Перад вамі — маёнтак Міхала Клеафаса Агінскага, які знаходзіўся ў Залессі паблізу Смаргоні. Гаспадар перарабіў яго ў сапраўдную культурную сталіцу гэтага краю. На святы ў Залессі збіралася да трох тысяч гасцей. Для іх ладзілі канцэрты з удзелам гаспадара, конныя забавы і спаборніцтвы, карнавалы, запускалі паветраныя балоны-мангальф'еры. Перад вамі падзеі балю, прымеркаванага да чарговых угодкаў вызвольнага паўстання на чале з нашым суайчыннікам Тадэвушам Касцюшкам. У наш час маёнтак Міхала Клеафаса адноўлены і зноў ператвараецца ў значны культурны цэнтр Беларусі.

незалежнасць»

знаёмы з харвацкімі і сербскімі пісьменнікамі, ведаў літаратуру, традыцыі і звычаі паўднёваславянскіх народаў.

У Чэхіі Баброўскі блізка пазнаёміўся з славутым славістам і таленавітым паэтам Вацлавам Ганкам. Прафесар Ганка быў у ліку вучоных, што распачалі ў родным краі барацьбу супроць засілля нямецкай мовы і за адраджэнне чэшскай культуры. Беларускі навуковец уважліва вывучаў досвед братоў-чэхаў, бо разумеў, што такое самае змаганне чакае і ягоны паняволены расейцамі народ.

На працягу ўсяго еўрапейскага падарожжа Баброўскі вёў дзённік і навуковыя нататкі, якія дасылаў на радзіму ў газеты і часопісы. Паколькі ён меў і літаратурны талент, ён мог ганарыцца шматлікімі чытачамі.

Наш вучоны вярнуўся на родную зямлю толькі праз пяць гадоў. І тут — як узнагарода — яго адразу чакала выдатнае адкрыццё. У кнігазборы манастыра ў Супраслі, што паблізу Беластока, Баброўскі знайшоў забыты Супраслеўскі летапіс — надзвычай каштоўны для гісторыкаў і мовазнаўцаў помнік старажытнага беларускага пісьменства.

Вяртанне Скарыны

У бібліятэцы таго самага Супраслеўскага манастыра Міхал часта працаваў яшчэ гімназістам. Там яму ў рукі ўпершыню і патрапілі кнігі Францішка Скарыны, якія ўразілі юнака сваёй моваю і мастацкай прыгажосцю.

У вандраваннях па Еўропе ён сустракаў скарынаўскія выданні ў розных кнігазборах. Схіляючыся над старонкамі кніг першадрукара і выдатнага асветніка, наш навуковец адчуваў гонар за выдатны плён працы земляка. Міхал наведаў Падую з яе славутым універсітэтам, дзе Скарына атрымаў навуковую ступень доктара «лекарскіх навук», і Прагу, дзе знакаміты палачанін распачаў выдавецкую дзейнасць. З вялікім хваляваннем Баброўскі хадзіў па тых самых вуліцах, наведваў храмы і аўдыторыі, што памяталі Францішка з слаўнага горада Полацка.

Вучонаму адкрылася веліч Скарыны, які надрукаваў чацвёртую ў хрысціянскім свеце Біблію на жывой мове і гэтым увёў беларусаў-ліцьвінаў у сям'ю перадавых еўрапейскіх народаў. Баброўскі лічыў, што беларуская мова павінна вярнуцца ў шырокі ўжытак, бо толькі з родным словам на вуснах беларусы змогуць напоўніцу раскрыць свае творчыя сілы.

Глыбокімі даследаваннямі Скарынавай спадчыны Міхал Баброўскі нанова адкрыў для сучаснікаў і для ўсяго свету імя беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, духоўнага волата той эпохі, якую называюць еўрапейскім Адраджэннем. Менавіта Баброўскі быў першым, хто назваў мову Скарыны беларускай.

Мы называем прафесара Баброўскага першым беларускім скарыназнаўцам. Звесткі пра Скарыну ён збіраў усё жыццё і ўключыў у кнігу «Славянскія друкарні ў Літве». Але гэтая кніга так і засталася ненадрукаванай і дагэтуль не знойдзена. У царскай імперыі на такія навуковыя працы глядзелі падазрона, бо яны нагадвалі паняволеным беларусам пра былую незалежнасць.

З прафесараў — у вясковыя святары

Каланіяльныя расейскія ўлады пільна сачылі за вучонымі, якіх любіла і шанавала вальналюбівая ліцьвінская моладзь. У 1824 годзе Баброўскага абвінавацілі ў падтрымцы таемнага студэнцкага таварыства філаматаў. Як і астатнім «недабранадзейным» выкладчыкам Віленскага ўніверсітэта, Міхалу Баброўскаму забаранілі чытаць лекцыі. Вучонага адарвалі ад улюбёнай справы і выслалі ў Жыровіцкі базыльянскі манастыр.

У прафесара знайшліся ўплывовыя заступнікі, і праз два гады ён вярнуўся ва ўніверсітэт. Але неўзабаве грымнула вызвольнае паўстанне 1831 года. У збройным змаганні брала ўдзел шмат студэнтаў і выкладчыкаў Віленскага ўніверсітэта. Каб адпомсціць патрыётам, цар загадаў зачыніць універсітэт.

Баброўскі быў ужо аўтарытэтным еўрапейскім вучоным, найперш у галіне славістыкі. Каланізатары ведалі, што прафесар — сябар навуковых таварыстваў у Парыжы, Лондане і Маскве, а таксама Археалагічнай акадэміі ў Рыме. Ён меў надзвычай багатую навуковую бібліятэку з некалькіх тысячаў тамоў і валодаў сямнаццаццю мовамі, у тым ліку арабскай. Нягледзячы на гэта, Міхала Баброўскага, выслалі ў мястэчка Шарашова на Пружаншчыне. Тут ён служыў святаром, але не пакідаў заняткаў навукай. Свае казані ў царкве айцец Міхал заўсёды прамаўляў па-беларуску, чым здабыў вялікую павагу ў вернікаў.

Яшчэ адным клопатам вучонага зрабілася выхаванне пляменніка Паўла. Дзядзька Міхал замяніў яму рана памерлага бацьку і стаў першым настаўнікам. Ён адкрыў хлопчыку багацце беларускай мовы і дзівосны свет нашай гісторыі.

Павел скончыў вайсковую акадэмію, займаў высокія пасады, але адначасова займаўся даследчыцкай працай. Усё жыццё з ім заставалася выхаваная дзядзькам-прафесарам глыбокая павага да мінуўшчыны роднага краю. Баброўскі-малодшы вывучаў беларускія летапісы і гісторыю Вуніяцкай царквы, напісаў краязнаўчыя нарысы пра Горадню, Слонім і Зэльву. З удзячнасцю ён даследаваў жыццё і дзейнасць свайго дзядзькі, які разам з аднадумцамі стварыў падмурак будучага беларускага адраджэння.

Магістр права і сакратар губернатара

Ігнат Даніловіч, як і Міхал Баброўскі, нарадзіўся ў сям'і вуніяцкага святара-беларуса на Беласточчыне. Родная вёска будучага вучонага — Грыневічы — уваходзіла ў Бельскі павет і цяпер таксама знаходзіцца ў Польшчы. Даніловіч прыйшоў на свет у 1788 годзе, калі радзіма нашых продкаў — Вялікае Княства Літоўскае — яшчэ захоўвала незалежнасць, хоць усходняя Беларусь у выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай ужо была захопленая Расеяй.

Вучыцца Ігнату давялося ўжо ў Расейскай імперыі: спачатку ў школе манахаў-піяраў у Ломжы, потым у Беластоцкай гімназіі ды на юрыдычным факультэце Віленскага ўніверсітэта. Разам з дыпломам пра вышэйшую адукацыю здольны юнак атрымаў навуковую ступень магістра права. Гэта значыць, што ён з маладых гадоў плённа займаўся вывучэннем законаў. На шляху да вяршыняў навукі магістру павінна было дапамагчы ягонае валоданне беларускай, польскай, лацінскай, нямецкай, французскай і расейскай мовамі.

У сям'і Даніловічаў жыла надзея на вызваленне Айчыны ад расейскага прыгнёту. Гэтыя спадзяванні тады былі звязаныя з французскім імператарам Напалеонам Банапартам. Таму не дзіва, што ў 1812 годзе, калі на некалькі месяцаў на вызваленых беларускіх землях было адноўленае Вялікае Княства Літоўскае, Ігнат Даніловіч стаў сакратаром прызначанага Напалеонам губернатара Беластоцкай вобласці.

Даследчык Статутаў

Ігнат Даніловіч чытаў у Віленскім універсітэце курс лекцый, прысвечаных старадаўнім ліцьвінскім законам. Ён дасканала вывучыў наш першы Статут, зацверджаны вялікім князем Казімірам Ягайлавічам у 1468 годзе, а таксама ўсе тры наступныя Статуты Вялікага Княства Літоўскага.З прафесарскай катэдры і ў навуковых працах Даніловіч падкрэсліваў, што продкі здаўна мелі выдатна распрацаваныя законы, якія бралі за прыклад іншыя народы.

Самым дасканалым зборам законаў у эпоху еўрапейскага Адраджэння і доўгі час пасля яе быў напісаны і выдадзены на дзяржаўнай беларускай мове Статут Вялікага Княства 1588 года. Адным з першых у гістарычнай і юрыдычнай навуцы гэтую думку выказаў прафесар Даніловіч. Ён смела сцвярджаў, што беларусы-ліцьвіны мусяць жыць паводле ўласных законаў і не хаваў мары зноў зрабіць мову Статута дзяржаўнай мовай адроджанай незалежнай краіны.

Студэнты ведалі, што ў пошуках дакументаў па гісторыі Літвы-Беларусі прафесар, не шкадуючы сваіх грошай, часта выпраўляецца ў архіўныя сховішчы Варшавы, Пецярбурга і Масквы, куды былі вывезеныя нашы нацыянальныя скарбы. Выхаванцы Даніловіча нярэдка і самі прыносілі яму старадаўнія рукапісы, знойдзеныя на вакацыях у бацькоўскіх або ў царкоўных і манастырскіх архівах.

Помста каланізатараў

Ігнат Даніловіч адкрыта выступаў за тое, каб усе былі роўныя перад законам, каб улады далі людзям свабоду слова і думкі. Ён заклікаў вызваліць сялянаў ад прыгоннага права. Прафесар смела згадваў Канстытуцыю Рэчы Паспалітай, знішчаную Расеяй. Універсітэцкія лекцыі Даніловіча часта сканчваліся гучнымі воплескамі студэнтаў.

Патрыятычная дзейнасць прафесара хутка зрабілася вядомай расейскім уладам. Як і прафесар Міхал Баброўскі, у 1824 годзе Даніловіч быў звольнены з Віленскага ўніверсітэта за сувязь з таварыствам філаматаў і «шкодны ўплыў на моладзь». (У ліку тых, хто зазнаў гэты ўплыў, — першы беларускі фальклярыст філамат Ян Чачот.) Каб зламаць вучонага і перашкодзіць ягоным даследаванням, Ігнату Даніловічу забаранілі жыць у беларускіх губернях.

Прафесара пераводзілі з Харкава ў Кіеў, адтуль у Пецярбург, потым зноў у Кіеў, а адтуль у Маскву. Яму загадвалі выкладаць то на адной, то на другой катэдры. Гэта забірала шмат сілаў і моцна падрывала здароўе, але не магло перайначыць мэтанакіраванага характару Даніловіча.

2500 дакументаў

Апынуўшыся ў неспрыяльных умовах, не маючы магчымасці вярнуцца на радзіму, Ігнат Даніловіч не здаўся і працягваў навуковую і выдавецкую працу. Ён надрукаваў Статут вялікага князя Казіміра і некалькі беларускіх летапісаў, падрыхтаваў да выдання Статут 1529 года. Прафесар-выгнанец выдаў кнігу дыпламатычных дакументаў з Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага — архіва вялікакняскай канцылярыі. Высокую адзнаку ў навуковым свеце атрымалі ягоныя артыкулы пра ліцвінскія летапісы і хронікі, пра адукацыю на старажытных славянскіх землях.

Шмат працаў Даніловіча пабачыла свет ужо тады, калі зямны шлях выдатнага знаўцы нашай старасвеччыны завяршыўся. Сярод іх была двухтомная «Скарбніца грамат». У ёй вучоны сабраў і апісаў 2500 гістарычных дакументаў ад першых звестак пра нашыя землі ў старажытных гісторыкаў Герадота і Страбона да часоў Люблінскай вуніі.

***

Праміне некалькі дзесяцігоддзяў, і служэнне Ігната Даніловіча ды Міхала Баброўскага беларускай справе працягнуць сотні іхніх паслядоўнікаў.

Малюнкі Паўла Татарнікава



На гэтай панараме вы бачыце нашых выдатных вучоных, прафесараў Віленскага ўніверсітэта Міхала Баброўскага ды Ігната Даніловіча пад час навуковай экспедыцыі ў старажытны Супраслеўскі манастыр пад Беластокам. Менавіта там яны зрабілі шэраг адкрыццяў, надзвычай важных для адраджэння беларускай культуры. У манастырскай бібліятэцы быў знойдзены Супраслеўскі рукапіс — самая даўняя (поруч з Тураўскім Евангеллем) рукапісная кніга Беларусі. Справа на малюнку — царква Звеставання Супраслеўскага манастыра (цяпер у Падляшскім ваяводстве Польшчы).


Фота www.junona.pro

Паміж прабелаў


Віктар СЛІНКА

***

Мы можам
Не толькі
Памерці,
Але й нарадзіцца
На адзін раз
Больш,
Чым памерці.

***

У паркавых шатах
Гнёздам утульней.
Ды амаль што наверсе
Камяніц гарадскіх
Вырастае малеча
Цікаўнейшая
Ды храбрэйшая

Удвая за астатніх.

***

Ты хочаш
Сабраць людзей,
Каб з зерняў
Сустрэчы й размовы
Прараслі каласы.

Хай жа
Спраўдзіцца!..

О, як гэта
Шмат, —

Асабліва на тле
Паўсядзённай самоты.

***

Канец канцлагеру надыдзе,
Калі апошні вязень сыдзе

З жыцця?

***

...Падчас
Ліўняў травеньскіх —
Ратаванне
З-пад абцасаў і колаў
Чарвякоў дажджавых,
Што сплываюць уніз,
Распростваючыся
Ва ўсю даўжыню.

***

Колер,
Якога няма ў палітры, —
Мабыць, у ім
Твой сэнс,
Кляновы
Кастрычнік позні?

***

Чуем
Ручай,
І кожны — сваё:
Пазвоньваюць
У капшуку манеты,
Перамаўляюцца
З дзяўчатамі хлопцы...
А мне — мацней
Хочацца піць.

***

Не хапае розуму
Схаваць
Сваю неразумнасць?..
Што ж,
Застаецца яе

Уздымаць над сабой.

***

Падняў бялюткі дым
гарбыль сухі,
Абсечанае голле ды сукі,
Пялёсткі, ветрам скінутыя ўніз,
З вакна да долу зрынуты
карніз,
Квіток трамвайны
па маршруце 7
І ўсё, што толькі ўмесціцца
ў кішэнь;
Ён лёгкі быў, таму і ўзняўся —
дым,
Зусім не абцяжараны сваім.

Але адносна нас такі закон
Наўрад ці дзейсны...

***

Жабруюць
І слова, і позірк,
Каб потым неяк прадаць
Іншым вачам ды вуснам
Ці абмяняць на хлеб
Бразготкі, —
Дажыць
Да наступнага шчасця...

***

Жыць з пераціснутым горлам
І пры гэтым трымацца горда?

А варухнешся, — скора
Пачуеш: «Паказвае нораў».

***

...Ад мінулага
Антыдот —

Кожны
Новы
Сонца ўзыход.

А святлейшае
Адгуло, —
Нам пяшчоты
Пральле святло.

***

Танная
Ўлада —
Пусціць
Альбо не пусціць
Таго,
Хто за дзвярыма.

Куды
Даражэй
Каштуе
Вырашаць самому,
Уваходзіць
Ці не...

***

Неадхільная верагоднасць
Патраплення
Стралой у стралу.
Ты жадала са мной
Прыгодаў?
Я якраз да цябе іду.
Цемру —
Хто рассячэ?
Зарніца?..
Спапялёная
Не ўпадзі:
Ці гатовая прытуліцца
Да агню
Сваімі
Грудзьмі?

***

Нам трэба
Спяшацца
Сваё
Шукаць,
А знайшоўшы,
Адкопваць марудна:
Раптам
Да нас
Змаглі пабываць
І — замінаваная
Рудня...

***

аказалася

табою
лёгка параніцца

меркавалася
ёю:
гэта ты

ранішся лёгка

цяпер
ейны клопат

замова
ўласнай
крыві

***

Балела ў грудзях, —
Пасля перастала.
Дні прамінулі,
Як летні дождж, —
Успамін
Аб кароткім шчасці.
Думка прыйшла:
«Ужо не баліць».
Ведай:
Гэта боль пасылае вестку
Перад сабой, —
Каб ты быў не гатовы

Сустрэць.

***

Хацеў,
Пакуль не ўспацеў.

Жадаў,
Пакуль не прыждаў.

Крапіў,
Пакуль не адпіў.

***

мінулае
вашае
нашае
іхнае
хоць
чыё
не можа быць
будучыняй
для дзяцей
усвядомім
хоць гэта ўключыўшы
глузд

***

пачынаем казаць
перад пачаткам размовы

баючыся спазніцца

познімся
перад пачаткам

***

Толькі не блытай
Падвядзенне вынікаў
Са звядзеннем рахункаў.

***

...нібы ў нябыту нам
пазычаныя дні
і мы жывем на плыткай глыбіні...

***

...дрэвы заходзяць у двор —
і застаюцца...

***

Упоравень стань
Са мною, —
Спусціся
На прыступку
Ці ўздыміся на дзве,
Каб чулі, што кажам
Мы,
А не хтосьці іншы,
І рабілі
Жаданае намі,
А не кімсьці яшчэ.

***

Пакідаць у мінулым сёння
Дзеля святога заўтра
Ці вучыцца насіць рукамі, —
Злучанымі, як чаша, —
Пясок — каб ні пясчынкі,
Што гэтак падобна да мігу,
Ты не прасыпаў побач;
Там, дзе свае ўмацаванні
Узводзяць на пляжы дзеці.

***

Няма той ва́гі,
На якой узважыць,
Што мае сэрца
Для каханай значыць.
А як прайду
Сцяжыну
Да той вагі,
Пакласці сэрца
Ці знайду адвагі?

***

...Так блізка твае й мае плаўнікі
Варушацца: не пакінь.
Дзве рыбіны б'юцца ўдарам
адным:
Гарпуншчык стаў ля ракі.

Ты мкнешся ў празрысты
Струмень-агмень,
Дзе кожны ўдых, як апёк;
Ці выжыве хтосьці
Да перамен —
Правалам адтуліна між
рабрын, —
Пад чоўнам?.. Там зеўрыць змрок.

Хай выжыве хтосьці
З тваіх ікрын...

***

Я начаваў чатыры начы
У хатцы лясной без святла.
Выгараў нават
Агарак свячны,
Што некалькі хвіляў
Міргаў ля сцяны,
Прыткнуты да краю стала.
Я начаваў чатыры начы,
Дзе
Да замка не падыдуць ключы,
Бо
Не было замка...

Човен — вазьмі, рака.

***

...заззяе промнем
на нажы
мая душа
тваёй душы...

***

Словы свае сказалі.

А трэба, каб нехта
Цябе
Пачуў,
Адгукнуўся
Хоць бы адзін.

Бо
Які б ты ні быў,
Голас твой —
Гэта хтосьці яшчэ.

Вяртанне грамадзянства Мілану Кундэру?

Як паведаміла ІА Regnum са спасылкай на AMNA, прэм'ер-міністр Чэхіі Андрэй Бабіш, выступаючы ў Францыі на ўрачыстасцях у гонар 100-годдзя з дня заканчэння Першай сусветнай вайны, заявіў, што ў Празе разглядаюць магчымасць аднаўлення чэшскага грамадзянства вядомаму пісьменніку Мілану Кундэру (якога яго пазбавілі яшчэ ў 1979 годзе).

А. Бабіш адзначыў, што яму дакладна не вядомая сама працэдура аднаўлення грамадзянства, аднак запэўніў, што «валакіты» не чакаецца.

Выдатнаму чэшскаму пісьменніку і драматургу, які нарадзіўся ў 1929 годзе, аўтару славутага рамана «Невыносная лёгкасць быцця», цяпер 89 гадоў. Мілан Кундэра ў цяперашні час жыве ў Парыжы.

Пасля ўдзелу ў дэманстрацыях і пратэстах падчас акупацыі Чэхаславакіі савецкімі войскамі ў 1968 годзе яго пазбавілі магчымасці выкладаць, а таксама канфіскавалі з бібліятэк яго кнігі. Выдавацца яму таксама забаранілі, і публікаваць свае творы ён мог толькі за мяжой. У 1975 годзе М. Кундэру запрасіў выкладаць Рэнскі ўніверсітэт у французскай Брэтані на пасаду прафесара. Пісьменнік змушана пакінуў сваю краіну і пасяліўся ў Францыі.

Праз тры гады ў Францыі ён выпусціў зборнік гісторый і эсэ «Кніга смеху і забыцця», за якую ўлады Чэхаславакіі ў 1979 годзе і пазбавілі яго грамадзянства. Усе наступныя творы і кнігі аўтара былі забароненыя да выдання ў Чэхаславакіі. У 1981 годзе М. Кундэра прыняў французскае



грамадзянства. Напісаны ў 1990 годзе раман «Неўмiручасць» стаў апошняй кнігай пісьменніка на чэшскай мове, пасля яго ён стаў пісаць на французскай.

У Чэхіі пісьменніка лічаць нацыянальным героем. У 2009 годзе ён стаў ганаровым грамадзянінам горада Брно, дзе нарадзіўся. Перыядычна пісьменнік бывае ў родных мясцінах, сустракаючыся з сябрамі, аднак робіць гэта інкогніта, пазбягае публічнасці і вядзе закрыты лад жыцця.

У 1985 годзе ў інтэрв'ю карэспандэнту выдання «The New York Times» ён заявіў, што лічыць Францыю сваёй адзінай радзімай.

PEN America і Дональд Трамп

Амерыканскі ПЭН-цэнтр (PEN America, літаратурны цэнтр амерыканскіх літаратараў і журналістаў) падаў у суд на кіраўніка Белага дома, сцвярджаючы, што пры ім «задыхаецца» свабода слова ў ЗША.

Амерыканскі ПЭН-цэнтр раскрытыкаваў кіраўніка дзяржавы як хулігана, аўтакрата, выкарыстальніка мовы нянавісці і ворага свабоды выказвання. ПЭН-цэнтрам былі апублікаваныя даследаванні, арганізаваныя петыцыі і заснаваны Фонд заахвочвання свабоды прэсы.

Цяпер літаратурная і праваабарончая арганізацыя, у шэрагах якой знаходзяцца тысячы аўтараў і журналістаў, распачала больш рашучыя дзеянні: ПЭН падаў у суд на амерыканскага прэзідэнта.

У пазове, які быў пададзены ў федэральны суд Манхэтэна, PEN America сцвярджае, што «афіцыйныя дзеянні» Трампа «парушылі Першую папраўку і клятву захоўваць Канстытуцыю». ПЭН-цэнтр прывёў такія прыклады, як паведамленні пра тое, што Трамп умешваўся ў прапанаванае зліццё AT & T і CNN, і Міністэрства юстыцыі імкнулася заблакаваць гэтае зліццё з падачы прэзідэнта.

У пазове таксама згадваюцца каментары Трампа аб уладальніку сусветна вядомага выдання «Washington Post» і заснавальніку кампаніі Amazon.com Джэф Бэзос. Трамп, незадаволены артыкуламі ў «Washington Post», пагражаў антыманапольнымі дзеяннямі супраць Amazon і прапанаваў павялічыць выдаткі на дастаўку. Паводле паведамлення, ён аказаў ціск на генеральнага дырэктара ЗША Меган Брэнан, каб падвоіць стаўкі. І таму Паштовая служба ЗША прапанавала некалькі зменаў на 2019 год, сярод якіх павелічэнне кошту дастаўкі, якая наўпрост уплывае на Amazon.

У позве арганізацыі гаворыцца: «Прэзідэнт Трамп мае права Першай папраўкі і можа вольна крытыкаваць прэсу, але ён не можа свабодна выкарыстоўваць уладу і аўтарытэт урада Злучаных Штатаў, каб пакараць і задушыць яе».

Чачэнскі «Яўгеній Анегін»

У жыхароў Чачэнскай Рэспублікі з'явілася магчымасць чытаць адзін з самых вядомых твораў Аляксандра Пушкіна – раман «Яўгеній Анегін» – на сваёй роднай мове.

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка і ўрада рэспублікі, у Нацыянальнай бібліятэцы імя Абузара Айдамірава прайшла прэзентацыя першага перакладу паэтычнага рамана вялікага класіка на чачэнскую мову. Яго аўтар – паэт, публіцыст і перакладчык, член Саюза пісьменнікаў РФ Хусэйн Хатаеў.

На прэзентацыі працы Х. Хатаева сабралася звыш 100 дзеячаў культуры, выкладчыкі чачэнскай і рускай моў, студэнты ВНУ і тэхнікумаў, журналісты.

Першым пераклад «Анегіна» ў трох нумарах надрукаваў літаратурна-мастацкі часопіс «Вайнах», а публікацыяй кнігі «зоймецца» выдавецтва «Грозненскі рабочы».

Хусэйн Хатаеў пачаў перакладаць на чачэнскую мову знакамітую трагедыю Уільяма Шэкспіра «Гамлет».

Акуляры Джэймса Джойса

Паводле паведамлення нацыянальнага тэлеканала Ірландыі RTE, на аўкцыёне, які прайшоў у Кілкэні, «пайшлі» з малатка акуляры-пенснэ з футаралам, якія належалі знакамітаму ірландскаму пісьменніку Джэймсу Джойсу.

Лот каштаваў калекцыянеру 17 тысячаў еўра. Кіраўнік аўкцыённага дома «Fonsie Mealy Auctioneers» не назваў імя пакупніка, аднак ён адзначыў, што да гэтага лота праяўлялі значную цікавасць калекцыянеры з Кітая, Японіі, Аўстраліі і ЗША. На RTE паведамлялі, што, хутчэй за ўсё, «каштоўны прадмет ірландскай культурнай спадчыны з вялікай доляй верагоднасці апынуўся за межамі выспы».

Арганізатар таргоў адзначыў: «Гэтымі акулярамі Джойс карыстаўся ў перыяд работы над раманам «Уліс». Ён падарыў іх свайму сябру Томасу П'югу, які часта бываў у гасцях у Джойса ў Парыжы». У камплект да акуляраў Джойса ўваходзілі аздоблены аксамітам футарал, пазалочаная кліпса-трымальнік і ланцужок.

Праблемы са зрокам у будучага літаратара выявілі яшчэ ў юным узросце, а пазней дадалося запаленне сасудаў вочнага яблыка. Брат Джойса – Станіслас – часта згадваў у сваіх дзённіках аб хваробах Джэймса, якія сур'ёзна абмяжоўваюць яго літаратурную працу.




Вядома, што калі адзін са знаёмых Джойса паскардзіўся, што раман «Уліс» вельмі складана чытаць, той адказаў: «Вы не ўяўляеце сабе, як цяжка яго было пісаць». Вялікія часткі 800-старонкавага рамана, за якія спачатку не хацеў брацца ніхто з выдаўцоў, Джойс перапісваў 6 разоў! Аднак яго біёграфы ўпэўненыя, што менавіта перыяды абвастрэнняў хваробы былі для літаратара самымі плённымі ў творчым плане.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы novostiliteratury.ru, «Associated Press», IA Regnum, CNN, RTE.

ПРЭМІІ

Прэмія Медычы

У гэтым сезоне галоўны прыз французскай Прэміі Медычы (Prix Médicis) дастаўся П'еру Гійоту за «паэтычную аўтабіяграфію» – кнігу «Idiotie».



Утворы апісваецца жыццё 18-гадовага юнака з восені 1958 года, які толькі што пакінуў сцены 9-гадовай школы-інтэрната ў Ліёне і ўступае ў дарослае жыццё, праводзіць ночы пад мастамі Парыжа і які пазней прайшоў алжырскую вайну.

Гэтую ўзнагароду стварыў 60 гадоў таму французскі паэт, празаік і драматург Жан-П'ер Жыраду, бо, на яго думку, вядомыя Ганкураўская прэмія і Гран-пры Французскай акадэміі зусім незаслужана абыходзілі сваёй увагай творчасць пісьменнікаў авангарду.

Спачатку Прэмію Медычы ўручалі прадстаўнікам школы «новага рамана», аднак пазней кола аўтараў было пашырана, але галоўная ўмова захавалася: яе ўручаюць «аўтару рамана або апавядання, імя якога яшчэ не вядома шырокаму колу чытачоў, але які валодае несумненным арыгінальным талентам».

З 1970 года ва ўзнагароды з'явілася намінацыя «Лепшы замежны твор», і Прэмію Медычы сталі ўручаць і замежным пісьменнікам, з 1985 года Prix Médicis Essai сталі ўручаць за лепшую эсэістыку.

У астатніх дзвюх намінацыях Prix Médicis былі названыя кнігі, якія ўжо заваявалі папулярнасць. Так, прэміяй Медычы ў намінацыі «Для замежных пісьменнікаў» (Prix Médicis Etranger) была ўзнагароджана амерыканская пісьменніца Рэйчэл Кушнер за раман «The Mars Room». Лаўрэатам Прэміі Медычы за лепшую эсэістыку сталі «Браты Лехман» Стэфана Масіні, кніга пра грошы, якія кіруюць светам…

Прэмія Голдсміта

Шатландскі паэт Робін Робертсан быў абвешчаны пераможцам брытанскай прэміі Голдсміта (Goldsmiths Prize 2018) за свой дэбютны паэтычны раман «The Long Take».

Паэма пра ветэрана высадкі ў Нармандыі, напісаная аўтарам з дапамогай спалучэння вершаў і прозы, атрымала прыз у 10 тысяч фунтаў стэрлінгаў за наватарскую выдумку ў жанры мастацкай літаратуры.

Р. Робертсан, які атрымаў мноства ўзнагарод за свае вершы, распавядае пра гісторыю Уокера, ветэрана D-Day з посттраўматычным стрэсавым расстройствам, які пасля заканчэння Другой сусветнай вайны не можа вярнуцца дадому ў Новую Шатландыю і шукае новы спосаб жыцця ў Нью-Ёрку, Лос-Анджэлесе і Сан-Францыска.

У кнізе «The Long Take», якая патрапіла ў шорт-ліст Букераўскай прэміі-2018, чаргуюцца вольныя вершы, дзённікавыя запісы, дакументальныя тэксты з часопісаў. «The Long Take» таксама ўключае ў сябе празаічныя ўспаміны пра вывучэнне жахаў вайны, старыя манахромныя фатаграфіі і мноства шрыфтоў для прадстаўлення таго, што Уокер бачыць на знаках і ў рэкламных аб'явах.

Сам аўтар называе свой твор «апавядальным вершам», а не раманам. У інтэрв'ю выданню «Man Booker» ён сказаў: «Я хацеў кінуць выклік самому сабе і напісаць нешта ў вялікім маштабе, што магло б задаволіць многія з інтарэсаў, якія не маглі быць лёгка вырашаны ў асобных вершах: амбівалентнасць, якую я адчуваю да гарадоў, і асабліва да амерыканскіх гарадоў, у вырашальнае пасляваеннае дзесяцігоддзе – з лепшым джазам і лепшымі фільмамі».

Заснаваная ў 2013 годзе пры падтрымцы часопіса «New Statesman» Лонданскім універсітэтам Голдсміта аднайменная літаратурная прэмія закліканая «адкрываць новыя магчымасці для новай формы» ў мастацкай літаратуры. Узнагароду ўручаюць брытанскім або ірландскім аўтарам, якія апублікавалі свой твор у Вялікабрытаніі.



Фота www.news.vitebsk.cc

Марк і Бэла Шагалы. Фота Шэпелева

Запаленыя свечкі

Бэла ШАГАЛ

Бэла Розэнфельд-Шагал нарадзілася 2 снежня 1889 года ў Віцебску. Жонка мастака Марка Шагала. Вучылася ў Маскве на Вышэйшых жаночых курсах. Цікавілася літаратурай, тэатрам. Яе рысы пазнавальныя ў тварах амаль усіх намаляваных Шагалам жанчын. Памерла ў амерыканскім шпіталі 2 верасня 1944 года.

Лазня

Для мяне шабат пачынаецца ўжо ў чацвер вечарам.

Мама паспешліва выходзіць з крамы — яна нібы хоча вырвацца з будзённай мітусні. Я чую яе голас:

— Башка, ты дзе? Мы ідзём у лазню! Саша, ты падрыхтавала ручнікі? Хутчэй, хутчэй, няма часу!

Служанка загортвае ручнікі ў пакунак і так туга сцягвае яго, што папера рвецца. Яна надзяе на мяне паліто, галёшы і моцна завязвае капюшон, ад чаго мне робіцца цяжка дыхаць.

— Не румзай, дурнічка, — кажа яна і выцірае мне слёзы. — На дварэ траскучы мароз. Ты можаш, барані Бог, прастудзіцца. Толькі гэтага мне яшчэ не хапала!

Мы з мамай амаль употай крадземся да парадных дзвярэй, быццам ужо субота і крама зачыненая.

Маме было б няёмка ісці праз краму з ручнікамі пад пахай, няхай і запакаванымі. Там заўсёды столькі людзей — хто ведае, магчыма, давялося б затрымацца. А мы спяшаемся, бо ўжо позна. Мама цягнула да апошняга моманту.

На дварэ стаяць сані, на якіх мы паедзем. Возчык, заўсёды адзін і той жа, чакае насупраць дома: ён ведае, што мама ездзіць у лазню кожны чацвер у адзін і той жа час.

Як толькі мы аказваемся вонкі, нас, нібыта вільготнай прасцінай, агортвае сцюдзёным вечаровым снегам. Па тым, як мама трымае мяне пад зношаным футравым пакрывалам, каб я, крый Божа, не вывалілася, я адчуваю, што яна ўжо забыла пра мітусню і беганіну ў краме. Сані быццам выхапілі яе адтуль у іншае, чысцейшае, паветра, і ўнутры яе ўжо загучалі святыя малітвы, якія яна з Божай дапамогай будзе казаць увечары перад шабатам.

Ехаць недалёка. Возчык зразае дарогу і вязе нас на бераг маленькай рэчкі Віцьбы, дзе знаходзіцца габрэйская лазня. Санкі шпарка слізгочуць праз паветра, якое дрыжыць ад марозу. Бачна, як наверсе, на іншым стромым беразе, мігцяць аганькі Падола — маленькай базарнай плошчы.

Я добра яе ведаю — гандляроў, крамы, асабліва малочныя скляпкі. Перад тым, як спускацца ў тыя крамкі па лесвіцы, па мокрых і слізкіх прыступках, трэба паклікаць Бога на дапамогу. І холадна там, нібы ў магіле. Па шэрых сценах сцякае вада. У вялікім склепе гарыць адзіная лямпа з закопчаным шклом, яе святло ледзь сягае жоўтых кавалкаў масла і шырокіх міс са смятанай і амаль зусім не прабіваецца да кута, дзе раскладзеныя падобныя на дзіцячыя галоўкі гомельскія сыры.

Добра бачныя толькі высокія вагі, якія тронам узвышаюцца пасярод склепа. Іх жалезныя ланцугі доўгімі чорнымі косамі гайдаюцца ў паветры, а медныя чашы з такім гонарам прымаюць убогі харч, нібыта вяршаць правасуддзе.

Гандляры ў доўгіх засаленых уборах з грубай тканіны дзелавіта расхаджваюць па склепе. Пальцамі, якія вытыркаюцца з абрэзаных рукавіц, яны адшчыкваюць кавалачкі ад вялізных галоў масла, наліваюць малако ў збаны, кідаюць адно аднаму кругі сыру, быццам гуляюць у снежкі, і пры гэтым крычаць так, нібыта іх б'юць. Магчыма, яны так саграваюцца. Час ад часу ў задушлівым паветры чутна грубая лаянка, полымя праклёнаў успыхвае і кідаецца ад аднаго прылаўка да іншага.

— Халера на цябе! Твой тавар смярдзіць!

— Няхай я заўтрашняга дня не дачакаюся, калі хлушу!

Гандляркі пішчаць, нібы мышы ў норах. Праклёны ўспаланяюць душы, і гандляры загараюцца ад гневу, зусім як жароўні на вуліцы, каля якіх скурчыліся заматаныя ў доўгія хусткі прадаўшчыцы смажанага бобу.

Гандляры лаюцца так палка і шчыра, што робіцца нават крыху весела.

Калі мы едзем у лазню, увесь гэты гвалт сустракае нас здалёк. Вецер даносіць да нас моцнае слоўца, якое вісіць у паветры, пакуль завея не прыцісне яго да зямлі і не засыпле снегам.

Вось мы і прыехалі.

— Забярэш нас адсюль, Бог дасць, праз дзве гадзіны, — кажа мама возчыку, хаця ён ужо колькі гадоў робіць гэта і ведае, калі везці нас назад.

На ўваходзе сядзіць білецёрка, якая ва ўсіх сваіх адзежынах нагадвае стос тканіны. Спачатку яна не варушыцца. Бачныя толькі яе нос і кончыкі пальцаў. На стале побач з білетамі ляжыць марожаная садавіна: яблыкі, грушы. У бутэльцы пеніцца шызаваты квас — мабыць, замерз.

Падобна, што нашае дыханне адаграе заледзянелыя вусны білецёркі: яны павольна расціскаюцца і расцягваюцца ў стылую ўсмешку:

— Задубееш тут сядзець цэлы дзень, — кажа яна і паціху адтае, — дзьме адусюль. Можна акалець, пакуль дачакаешся хоць якую чалавечую істоту.

Мама спачувальна падбадзёрвае яе і купляе мне яблык і грушу.

Мы адчыняем нізкія дзверы, якія вядуць у лазню. Бразганне засаўкі ўспуджвае з лавак дзвюх ці трох голых цётак, прыкрытых хусцінамі. Цяпер яны раяцца вакол нас і гудуць, нібы мухі:

— Вечар добры, Альташка, вечар добры! Што так позна? Як маешся, Альта? Дзеткі не хварэюць? А ты як, Башынька? — яны ласкава паляпваюць мяне з усіх бакоў. — Ды ты расцеш як на дражджах, цьфу-цьфу, беражыся нядобрага вока!

Яны недарма чакалі, яны зноў бадзёрыя. Хусціны цёмнымі крыламі ападаюць долу, і я дзіўлюся на іх белыя целы. Усё вакол робіцца святлейшым і чысцейшым

У гэтым гарачым прылазніку, дзе вільготнае паветра змешваецца са скразняком звонку, я ледзь пазнаю лазеншчыц, хаця яны заўсёды адны і тыя ж. Кожны наступны чацвер яны здаюцца мне ўсё больш старымі і брыдкімі.

Маладзейшая абхоплівае мяне кашчавымі рукамі, ад яе пахне спляснелай хусцінай.

— Холадна, так? Тады пачнём. Расшпілі сукенку, кінем яе ў куфар. Давай, падымі нагу! — яна гаворыць са мной як з канём.

Не паспяваю азірнуцца, як мае боты разам са скручанымі панчохамі ляцяць у чорную скрыню, якая ўжо пада мной. Седзячы на вечку, я так хутка ўздымаюся і падаю разам з ім, што не паспяваю заўважыць, што робіцца ў скрыні, куды, нібы ў змрочную яму, правальваюцца мае апранахі.

Праз шчыліны ў пакрытых ледзянымі ўзорамі, залепленых снегам вокнах дзьме вецер. Я трасуся ад холаду. Лазеншчыца бярэ прасціну і загортвае мяне.

— Пачакай жа трошкі. Ціха, ціха, зараз будзе цяплей. Усё, хадзі ў лазню.

Я агаломшаная. Нібы асуджаную на смерць курыцу, яна валачэ мяне да дзвярэй, сціснуўшы жалезнымі абцугамі рук.

— Глядзі толькі не ўпадзі, Божа ж ты мой! Асцярожна, Башынька, тут слізка.

Ля дзвярэй лазні ў мяне займае дыханне. Амаль непрытомную, мяне запіхваюць усярэдзіну. Скрозь гарачую пару я амаль нічога не бачу. На кручку над дзвярыма вісіць невялікая бляшаная лямпа. Шкло ў ёй не падыходзіць да рамкі, хістаецца і звініць, калі дзверы адчыняюць.

Я спыняюся і баюся паварушыцца. Падлога мокрая і гладкая, вада крапае на ногі, крапае са столі, са сцен, быццам увесь пакой абліваецца потам.

Лазеншчыца бярэ цэбар з вадой і аблівае лаўку, каб я магла на яе сесці. Ёй няма калі сказаць мне нават слова. Яе бліскучая худая спіна круціцца каля мяне і выгінаецца, як кашэчы хвост.

У цэбрах побач са мной булькоча вар, гарачая пара пячэ мне твар. Але цёплая лаўка супакойвае мяне, і я асцярожна апускаю ступні ў цэбар з цеплаватай вадой. Лазеншчыца падыходзіць да мяне ўшчыльную. Абвіслыя шары яе грудзей боўтаюцца перад маімі вачыма, надзьмуты барабанам жывот упіраецца ў мой нос.

Цяпер я сяджу, заціснутая паміж ёй і цэбрамі. Немагчыма нават павярнуцца.

Жанчына запускае шурпатыя пальцы ў мае доўгія валасы. Бярэ кавалак жукаўскага мыла і пачынае церці ім маю галаву, водзіць ім туды-сюды, быццам хоча яе адпрасаваць. Мокрыя валасы аблепліваюць мяне. У галаве круціцца… Я не магу заплакаць, глытаю слёзы і змываю, змываю кусліваю мыльную пену, якая выядае вочы, лезе ў вушы і рот. Асляплая, я абмакваю пальцы ў халоднай вадзе ў цэбры побач са мной. Толькі пасля таго, як валасы спалосквуюць, я адраджаюся. Пяшчотныя кроплі чыстай вады супакойваюць вочы. Я пераводжу дух, набіраюся смеласці і расплюшчваю іх.

Тут я чую, што рыпяць дзверы, і на парозе з'яўляецца мама — голая і белая.

Яна адразу ж знікае ў воблаку гарачай пары. Дзве лазеншчыцы падтрымліваюць яе з бакоў. На грудзях і жыватах жанчын праступае пот. Па закладзеных за вушы валасах сцякаюць кропелькі.

Мама ціха і сарамліва спыняецца каля дзвярэй. Лазеншчыцы кідаюцца да цэбраў, на ўсю моц адкрываюць краны і абмываюць для яе лаву.

Мама спакойна сядае, і яе поўнае цела займае лаву цалкам.

Я настолькі знясіленая мыццём і расціраннем, што амаль не бачу маму. Яна саромеецца мяне і хавае позірк, калі я гляджу на яе валасы. Замест звычайнага шчыльна завітага парыка бачныя яе ўласныя рэдкія валасы. Яны паступова павыпадалі — гадамі без паветра, прыдушаныя цяжкім парыком. Мне робіцца зусім сумна, сілы пакідаюць мяне, і я без супраціўлення дазваляю мыць сябе далей.

Лазеншчыца нібыта завалодвае не толькі маім целам, але і душой. Яна кладзе мяне на лаву як кавалак цеста, месіць і шчыпае, быццам фармуе з мяне бохан хлеба.

Я пераварочваюся на жывот. Раптам яна так моцна пляскае мне па спіне, што я падскокваю.

— Ну што, Башынька, як табе? Добра, га? — да лазеншчыцы раптам вяртаецца здольнасць гаварыць. — Глядзі, як пачырванела! Адно задавальненне ўшчыкнуць такую!

Замучаная да паўсмерці, я толькі і чакаю, калі яна адчэпіцца. Тут мяне скаланула: ззаду, з-за плячэй, на мяне абрынаецца вадаспад. Я цалкам знікаю ў струменях вады, яны падхопліваюць мяне і кудысьці нясуць. Лазеншчыца вылівае на мяне цэбар, мне робіцца зусім горача, і я з прыемнасцю адчуваю, што таю, бы мяккі воск.

— Во-о-ось та-ак! — лазеншчыца з палёгкай уздыхае і мокрай рукой выцірае сабе нос. — Цяпер ты блішчыш не горш за брыльянт, Башынька. На здароўе, маё дзіцятка!

Яна аглядвае мяне сваім шкляным, размытым вадой позіркам і хуценька заварочвае ў цёплую прасціну. Ёй, канечне ж, і самой хочацца выцерціся, але яна павольна абхоплівае мяне абедзвюма рукамі, быццам я шабатняя свечка, якую яна мусіць блаславіць.

Я здаля назіраю за тым, што адбываецца з мамай. Безумоўна, яе таксама намылілі і надраілі, і, вядома, яна таксама парадавалася цёпламу абліванню. Але з ёй усё не так хутка, як са мной. Пасля мыцця лазеншчыца падсоўвае маме нізкі ўслончык і прысаджваецца ля яе ног. Яна ставіць маленькі латунны падсвечнік на скрынку, запальвае аганёк, падпраўляе

кнот і пачынае плакацца маме на цяжкае жыццё. Яе спіна згінаецца так нізка, быццам усе турботы леглі на яе і прыціскаюць галаву да маміных ступняў.

— Няхай Усёмагутны злітуецца і пазбавіць нас турбот, — кажа яна і ўздымае галаву. — Хай будзе так, Гасподзь у небе.

І, нібыта каб забыць пра нягоды, яна пачынае калупацца з мамінымі пальцамі. Пасля кожнага благаславення, якое яна мармыча перад тым, як зрэзаць пазногаць, свечка, здаецца, успыхвае ярчэй, а душа лазеншчыцы трошкі яснее. Мама назірае, што яна робіць з яе пальцамі, і цярпліва слухае балбатню. Святло свечкі перад імі ясным арэолам выхоплівае абедзвюх жанчын са змроку. Два схіленыя адзін да аднаго белыя твары свецяцца, нібыта падрыхтаваныя да святога дзейства.

Апрацаваўшы маміны пазногці, старая лазеншчыца ўздымае галаву і ціха прамаўляе:

— Альта, цяпер пойдзем у мікву.

У мамы перахоплівае дыханне, быццам старая прагаварылася пра нейкую таямніцу. Абедзве жанчыны павольна ўздымаюцца, выпроствающца і цяжка ўздыхаюць, нібыта мусяць увайсці ў святая святых. Абрысы іх белых пастацяў размываюцца ў цемры. Я заўсёды пабойваюся дарогі да міквы. Трэба мінуць парылку, дзе на доўгіх лавах пакутуюць няшчасныя істоты. Іх хвошчуць бліскучымі бярозавымі венікамі, яны стогнуць, быццам іх смажаць на распаленых вуглях. Жар забіраецца мне ў рот, сціскае сэрца. «Гэта пекла для тых, хто шмат грашыў», — кажу я сабе і хуценька бягу за мамай у па-турэмнаму цёмны пакой, дзе знаходзіцца міква.

Старая лазеншчыца стаіць на маленькіх сходах, трымае запаленую свечку і льняную прасціну.

Мама — мне страшна за яе — моўчкі спускаецца па слізкіх прыступках усё глыбей у ваду, пакуль тая не даходзіць да шыі.

Калі старая кажа благаславенне, мама ўздрыгвае, нібы ад прысуду. Яна заплюшчвае вочы, затыкае нос і, быццам назаўсёды, знікае пад вадой. Божа, беражы!

— Ко-о-ошэр! — прароцкім голасам выкрыквае старая.

Мяне перасмыкае як ад удару маланкі, я дрыжу і чакаю. Вось зараз з-пад чорных столевых балак бліснe і ўсіх нас заб'е. А можа, з каменных сцен пальцеца вада, і мы ўсе захлынёмся ў патопе.

— Ко-о-ошэр! — другі раз крычыць старая. Дзе ж мама? Я больш не чую ніводнага ўсплёску.

Тут раптам вада расступаецца, і з глыбіні паказваецца маміна галава. З мамы цячэ, яна абтрасаецца, быццам узнялася з марскога дна. Не магу дачакацца, калі старая скончыць крычаць, каб ёй больш не трэба было ныраць. Яна ж ужо даўно стамілася. З яе валасоў, з вушэй збягае вада.

— На здароўе і жывіце доўга, Альта.

Цяпер ужо і старая лазеншчыца ўсміхаецца. Яе сухарлявыя рукі высока ўздымаюць льняную прасціну. Мама загортваецца ў яе, нібы ў белаcнежныя крылы, і ўсміхаецца, як анёл.

Ад мяне, апранутай, яшчэ ідзе пара. Я чакаю маму і жую яблык, які паспеў раскіснуць.

Яна ўваходзіць і адразу пачынае мяне праспешваць, нібыта толькі цяпер успомніла, што яшчэ працоўны дзень і крама адчыненая.

Святасць і цяпло лазні злятаюць з мамы, і яна нецярпліва апранаецца.

Жанчыны падаюць ёй адну адзежыну за адной, потым боты, і ўвесь час расказваюць пра сваю нядолю, быццам баяцца, што мама сыйдзе да наступнага чацвярга, а яны не паспеюць аблегчыць душу. Дрыготкімі рукамі яны загортваюць бялізну ў паперу, пасля запакоўваюць і мяне. Апухлая ад гарачыні, я ледзь магу паварушыцца.

Мама раздае чаявыя і зноў выслухоўвае доўгія пажаданні дабра, з якімі нас выпраўляюць дадому.

— На здароўе, Альта! Бог дасць, да наступнага чацвярга. Шчаслівай дарогі! Будзь здаровая, Башынька, бывай!

Яны перакрыкваюць адна адну і таропка абмотваюцца хусткамі.

Дзверы быццам самі сабой адчыняюцца. На імгненне мы застываем на парозе. Божа мой, якая халадэча! З цёмнага неба падае снег. Сняжынкі блішчаць, як зоркі.

Можа, цяпер дзень, а не ноч? Перад вачыма — бялёсая мітусня, і я не адчуваю нічога, апроч холаду.

Возчык і ягоны каняка ператварыліся ў снежныя пагоркі. Яны замерзлі?

— Лёгкай пары! — кажа возчык і ўсміхаецца. Яго ніжняя губа аддзяляецца ад заледзянелых вусаў, а з кусцістых броваў падаюць камякі снегу. Конік таксама ажывае і ржэ.

— Шчаслівa дабрацца! — усё яшчэ крычаць нам з дзвярэй лазні.

Санкі рушацца з месца. «Гоп, гоп!» — гаркае возчык і сцябае лядашчага каня бізуном.

Дабраўшыся дамоў, мама прабягае скрозь дзверы яшчэ хутчэй, чым пры ад'ездзе, і адразу адкладае пакунак з бялізнай. Пахі дому, крамы б'юць нам у твар.

— Бог ведае, што тут без мяне нарабілі! — з вінаватым выглядам мама спалохвае расчырванелы твар і спяшаецца ў краму.

Цяпер мне шкада, што гарачая лазня так хутка скончылася.

Настаўнік

Стары настаўнік, які прыходзіць нас вучыць, ценем шмыгае праз двор. У мяне ёкае сэрца.

Худы і мізэрны, ён прыціскаецца да сцен, быццам баіцца кагосьці зачапіць. Зношаны цемнавата-зялёны палітон ледзьве прыкрывае ягоныя плечы, рэдкая казліная бародка панура звісае.

— Ну што, Башынька? — выціскае ён з сябе ўсмешку. — Ты добра вывучыла алфавіт? Ідзі, пакліч Абрамеле. Сёння мы старанна папрацуем, праўда ж?

Я бягу ў дом і крычу:

— Абраша, Абраша, настаўнік прыйшоў!

Мой брат, мабыць, убачыў настаўніка раней за мяне. З пакойчыка, у якім заўсёды зачыняецца, калі ў нас пачынаюцца заняткі, ён шэпча:

— Давай занясі яму шклянку чаю і варэнне!

— Але ж ты прыйдзеш? — ціха кажу я ў замочную шчыліну. Я не магу ўвесь час сядзець сам-насам з настаўнікам.

— Ідзі ўжо, хутка прыйду. Скажы, што ў мяне баліць жывот.

Настаўнік сядае за стол. Ён пазяхае, працірае акуляры, смаркаецца і бярэ панюшку табакі. Потым раскрывае кнігу, якую заўсёды носіць з сабой.

— Дзе ж вы, дзеткі? — ён азіраецца, трымаючы палец у кнізе.

— Я тут! Можа, хочаце шклянку чаю? — я стаўлю побач з кнігай варэнне і гарачы чай.

Ад яго ўздымаецца воблачка пары і затуманьвае акуляры настаўніка, пах вішнёвага варэння казыча яму нос. Настаўнік робіць глыток, другі. Яму робіцца горача, але ён не ставіць шклянку, пакуль не выпівае ўсё.

— Хочаце яшчэ чаю? — не дачакаўшыся адказу, я хапаю шклянку і выбягаю з пакоя.

— Дык дзе Абрамеле? Яго няма дома? — і настаўнік просіць мяне больш не насіць чай.

— Добра, рэбе. Я паклічу яго. Ён казаў, што зараз прыйдзе.

— Абраша! — я стукаю ў дзверы. — Настаўнік чакае! Ідзі ж урэшце!

— Ты давала яму чай з варэннем?

— Так, ужо некалькі шклянак, і варэнне яму абрыдла. Мне страшна. Зараз жа выходзь!

— Не магу. Цяпер у мяне праўда разбалеўся жывот. Я не вінаваты.

Я ведаю, што Абраша маніць. У яго зусім нічога не баліць, проста ён хоча схавацца ад заняткаў.

Я зноў іду да настаўніка. Ён бездапаможна сядзіць над пустой шклянкай.

— Рэбе, можа, жадаеце яшчэ шклянку чаю? Толькі што зноў разагрэлі самавар, — і, перш чым ён паспявае адказаць, я выхопліваю шклянку з ягонай рукі. Мне сорамна зноў несці яму чай, сорамна глядзець яму ў вочы.

Гарачая пара ўздымаецца да яго твара, ягоныя вочы пачынаюць міргаць.

І тут мне робіцца па-сапраўднаму страшна, што рэбе ад гарачыні страціць прытомнасць. Зусім знямоканы, ён сядзіць, заплюшчыўшы вочы і звесіўшы галаву.

Я гляджу на яго і не пазнаю — так ён пастарэў. Ягонае цела амаль цалкам заслоненае сталом, бачная адно маленькая галава з казлінай бародкай.

Толькі цяпер я заўважаю, наколькі змучаны ягоны твар, якая танюткая шыя, такая ж жоўтая, як старонкі малітоўніка на стале. Ягоныя вусы і кончыкі пальцаў таксама жоўтыя — ад нюхальнай табакі.

Няўжо ён і праўда такі стары? Нават ад ягонай вопраткі патыхае старасцю. «А што, калі рэбе не зможа сам дабрацца дадому? — думаю я. — Можа, папрасіць каго з ягонай сям'і, каб прыйшлі па яго? Дзе рэбе ўвогуле жыве? Ці ёсць у яго дзеці? Яны такія ж свавольнікі, як мы?» Тут мне прыходзіць да галавы, што ў яго нікога няма, і маё сэрца сціскаецца. «Ён зусім адзін у свеце, як былінка ў полі…»

І я радая, што стары спіць, што не бачыць, як я пачырванела. Мне здаецца, ён заснуў не ад гарачага чаю, а ад засмучэння, што мы так кепска вучымся. Ён зусім ціхмяны, яму хочацца навучыць нас алфавіту, каб мы змаглі прачытаць хаця б старонку з Бібліі, як ён звычайна кажа.

Чаму ён баіцца быць з намі строгім? Ён мусіў бы насварыцца на нас, гэта было б нашмат лепш! Мы ж не бацькі, не ягонае «начальства», як ён кажа.

Мы кепскія. Мы спачуваем яму толькі калі ён спіць.

Мне хочацца сказаць яму, што ад сёння я буду добра вучыцца і магу паклясціся ў гэтым усім святым. Я не буду больш насіць яму чай шклянку за шклянкай. Я пужаюся: мой шэпт занадта гучны, ён можа разбудзіць рэбэ. Я сяджу на сваім месцы зусім ціха.

«О, — думаю я, — а што, калі Абраша забяжыць сюды і разбудзіць настаўніка? Няхай у нас ён прынамсі выспіцца. Пэўна ж, ён усю ноч вывучае Тору і не спіць».

Тут у пакой праз адчыненае акно прасочваецца водар шакаладу. Пах такі моцны, што я міжвольна пазіраю на настаўніка: ці не прачнуўся ён?

Салодкі водар воблакам лунае над маёй галавой, казыча язык, прабіраецца ў нос. Я п'янею.

Як крыўдна, што менавіта ў гэты момант я не на двары! Я ведаю, што на кухні кандытарскай «Жан Альбер» вараць шакаладную глазуру і намазваюць яе на торты. Калі б цяпер я была там, пекары паклікалі б мяне і далі аблізаць вялікую драўляную лыжку, якой перамешваюць шакалад. Стары пекар, якога я пабойваюся, калі ён выходзіць на двор, у гарачай пякарні выглядае саладзейшым за выпечку, якую ён па-майстэрску вырабляе. Ён прыязна ўсміхаецца, так што бачныя чорныя, папсаваныя цукрам зубы, яго фартух заляпаны шматкаляровай глазурай, якой ён упрыгожвае торты.

Я ўяўляю, як пекар падносіць да рота доўгі ражок і дзьме ў яго. Адтуль выпаўзае тлустая каляровая маса, а на торце з'яўляецца чырвоная кветка ці зялёны лісток.

Тады ён бярэ іншы ражок, дзьме, і на пірог выскоквае анёлак з крыльцамі. Драўлянай лапаткай пекар разгладжвае анёла і ўсе няроўнасці на торце. Салодкія крошкі падаюць долу.

Пекар ведае, што я гляджу на яго як на чараўніка.

— Што, прыгожа? Хочаш рэштачак?

Ён усміхаецца і насыпае мне поўныя прыгаршчы салодкіх крошак.

Я гляджу на далонь — у ёй нічога няма, азіраюся — перада мной спіць настаўнік.

Ах, калі ж ён нарэшце выспіцца? Я прапушчу салодкія крошкі. Калі я спазнюся, у пякарні будзе цёмна, яе зачыняць…

Можа, хуценька збегаць туды? А калі настаўнік прачнецца?

«Ш-ш-ш!» — я чую ціхі шолах. Што гэта — вецер? Ці гэта настаўнік пасопвае ў сне?

Я высоўваюся з акна, ледзь не вывальваюся з яго. Зверху, з кватэры фатографа, падаюць маленькія белыя лісткі. Памятыя, скамечаныя, яны, нібы белыя галубы, ляцяць праз двор, падаюць на прыступкі.

Я выцягваю рукі, спрабую злавіць лісткі. Я ведаю, што гэта карткі, якія выкідвае фатограф. Пажоўклыя, палінялыя. Тут праколатае вока, там праціснутая шчака — твар амаль непазнавальны.

Вось дзяўчына шырока раскрыла вочы, яна быццам задыхаецца ў сваім высокім каўняры. Вунь стаіць салдат з доўгімі вусамі. Ён выглядае вельмі спалоханым, нібыта ўбачыў генерала, які зараз на яго накрычыць.

Я схапіла яшчэ адну картку, разглядваю яе. Дзякуй Богу, што я яе злавіла! На белай хусціне ляжыць голенькае немаўля. Няхай яно і пухлае, нібы парсючок, але ўсё роўна пабіла б галоўку, калі б упала на зямлю.

«Пагуляй са мной, давай, усміхніся!» — і дзіця сапраўды смяецца.

Я лаўлю яшчэ адну фатаграфію. На ёй ажно цэлая сям'я. Як фатографу хапіла духу яе выкінуць? Уся сям'я на адной картцы! Дзядуля з бабуляй, яшчэ адна бабуля, дзядзькі, цёткі, бацька, маці, сыны, дочкі, жанатыя і нежанатыя, маленькія дзеткі… Крэслаў хапіла не ўсім, таму, мабыць, тыя, што стаяць ззаду, выглядаюць такімі незадаволенымі. Дзеці сядзяць спераду на падлозе…

Аднойчы я доўга разглядала такую ж сямейную картку і не стрымалася. Пайшла да мамы і спытала, ці не можам мы таксама так сфатаграфавацца.

— Фатограф жыве ў нашым доме, — сказала я, — і мы маглі б бачыць сябе ў ягонай вітрыне.

Мама кідае на мяне знішчальны позірк:

— Ты звар'яцела? Ці проста без мазгоў? Табе нічога лепшага ў галаву не прыйшло? Пайсці ды сфатаграфавацца, як нейкія дзеўкі са сваімі салдатамі!

Чаму мама на мяне налаялася? Дзядуля ж таксама адзін раз фатаграфаваўся! Ну так, яго падманулі: калі ён спакойна стаяў за прылаўкам, яму сказалі не рухацца, бо трэба памераць краму. Дык фатограф мог бы прыйсці да нас нібыта памераць краму і ўсіх нас сфатаграфаваць…

— Башка! — крычыць Абраша, які нарэшце выходзіць са свайго пакоя. — Настаўнік пайшоў ужо.

— Тсс! — я спалохана махаю яму абедзвюма рукамі. — Ціха! Ён спіць!

Але вокліч Абрашы разбудзіў настаўніка.

Дзякуй Богу, сон яго падбадзёрыў. Ён адразу агоўтаўся, глядзіць на нас і бярэцца за кнігу, быццам зусім і не спаў.

— Так, дзеці, на чым мы спыніліся? Паўтарайце: алеф, бэт…

— Гімель, далет! — гучна крычу я і радуюся, што настаўнік на нас не злуецца.

— Хе, вав! — перакрыквае мяне Абраша.

Упершыню мы паўтараем алфавіт ад пачатку і да канца. Настаўнік зззяе ад задавальнення.

— Вы не стаміліся, дзеткі? Сёння вы слаўна папрацавалі. Можа, тады хопіць?

Ён надзявае свой стары палітон і ціха сыходзіць.

Пераклад паводле выдання: Bella Chagall. Brennende Lichter. Rowohlt, 1990.

Пераклад з нямецкай Ігара Крэбса, prajdzisvet.org

Фігуркі на Каляды



Вольга РОПАТ

Прачнулася жоўтая лямпа. Заварушыўся пушысты ёлачны дожджык, падміргнула гірлянда.



Агата паставіла на авальны стол глыбокую талерку з залацістым абадком. У талерцы дрыжала вада і спрабавала зразумець, чаму ноччу яна апынулася ў невялічкім пакойчыку, напоўненым чароўным марывам і мяккім расталым святлом. Яскравыя агеньчыкі бліснулі, ганарлівыя ёлачныя цацкі нават і не думалі глядзець у бок талеркі, а «дожджык», здавалася, зашамацеў яшчэ болей. Вітражныя адлюстраванні праз некалькі хвілін супакоіліся, і вада ўздыхнула.

Тым часам Агата запаліла блакітную свечку. Дзяўчынка села насупраць свечкі і талеркі, чакаючы, пакуль расплавіцца млявы воск. У сінім акне плавала адзінокае святло ад свечкі. Блакітныя слёзы павольна сцякалі.

Стрэлкі на гадзінніку амаль зліліся. Яны вырашылі перадыхнуць менавіта на дванаццаці. Агата рэзка нахіліла свечку, і вада схапіла цёплы, мяккаваты васкавы згустак.

Кх..кх... Што гэта? Злавіць гук! Кххх.... Дзе гэта? Агата агледзела пакой і пайшла да сценкі, дзе хаваліся маленькія іконы і царкоўныя свечы. За шклом яна ўбачыла...

***

Яна варушылася, падскоквала. Дванаццаць месяцаў маўчалі. Толькі слухалі шэпт свечак і назіралі за Агатай. А між тым, унутры ўсё бурліла і вырывалася. Жыццё вырвалася з крохкага...

***

Цацку ў выглядзе доміка, якая так доўга чакала ўнутранага вызвалення, хацелася лашчыць поглядам. Раптам яна раскалолася. Узляцелі серабрыстыя іскры. Трэск нагадаў Агаце гук празрыста-блакітнай ільдзінкі. З цацкі даносіліся галасы і крык маленькага дзіцяці. Хто жыве ў доміку? Бурштынавае святло, што выпырхнула з ёлачнай цацкі, растварылася. Паўпразрыстыя сілуэты наліліся колерамі, і перад Агатай з'явілася сям'я: мужчына, жанчына і маленькія дзеткі. Яны радаваліся.

— Давай, Танішня, падымай шклянку!

— Ура! Ура! — заплёскаў маленькімі ручкамі хлопчык. Ён схапіў цукерку, — паляцеў на стол бліскучы фанцік, быццам карнавальнае канфеці, — і падскочыў некалькі разоў.

Жанчына пацягнула частку фаршыраванай рыбы — парушыла парадак на вузкай талерцы, зачапіла кавалачак халадца, які задрыжэў і баяўся ўпасці, бо ўяўляў сябе каралём стала.

Мужчына скрывіўся ад «Маскоўскай» і прагна ўкусіў бутэрброд з адзінокімі шпротамі. Засталіся святкаваць толькі хвасты.

«Маскоўская» чакала, калі прагучыць якое-небудзь віншаванне, каб цалкам авалодаць мужчынам. Празрыстая вадкасць заўсёды дзейнічала па плане...

Генка, якому на той момант было чатыры гады, наскакаўся пад песні і пацягнуўся, каб не бачыла маці, яшчэ па адну карамельку. Тата задаволена жаваў вінегрэт і назіраў за малым. Позіркі хлопчыка і Валерыя сустрэліся ў той момант, калі зялёны лядзяш яшчэ не паспеў пазнаёміцца з языком. Мужчына падміргнуў малому, і той спакойна, нават з задавальненнем (бо маці ўсё ж такі не заўважыла — і гэта галоўнае) паклаў у рот празрысты лядзяш, які нагадаў хлопчыку прыгожую пацерку з узорамі.

Аднагадовая дзяўчынка супакоілася толькі пасля таго, як яе на рукі ўзяла маці. Яна слухала тэлевізар «Нёман» і назірала за тым, як рагаталі, пераліваліся ад смеху цукеркі «Сняжок», «Казка», «Вавёрка», «Цацкі», усмокталі святло мядовых лямпачак мандарыны, дрыжэў паўпразрысты халадзец, чакаў свайго часу пірог з карыцай і падазрона на «Маскоўскую» кідаў позіркам шкляны збан з кампотам, у якім вадзілі карагод яблычныя долькі.

Вядучыя тэлевізійнай праграмы яшчэ раз павіншавалі з 1969 годам.

***

— Нічога сабе! — парушыла цішыню Агата. — Дык, гэта ж мой дзядуля з бабуляй! Як я адразу не здагадалася!? Здаецца, я гляджу жывы фільм!

Дзяўчынка баялася дакрануцца да іх... Можа, яны спалохаюцца і пераўтворацца ў фігуркі?..

***

Насамрэч, гэта быў не фільм. І не батлейка. І не тэатральныя сцэнкі. І не перформанс. І нават не галаграма. І гэта не сон! Агата тэлефанавала мне дзесьці ў палове дванаццатай ночы і пачала віншаванне са слоў «Добры вечар! Шчодры вечар! Добры вечар таму, хто ў гэтым даму! А людзей тут цераз край, хоць ты лыжкаю мяшай!..» Я сказала Агаце, што нікога ў мяне няма. Хлусня ўсё гэта.

Так, яна, безумоўна, любіць штосьці прыдумляць, любіць сюррэалізм, асабліва Жана Както, Дэвіда Лінча (о! з якімі эмоцыямі распавядала калісьці пра «Синий бархат») і Яна Шванкмаера... Дарэчы, я таксама ў захапленні ад Както і Шванкмаера... Але ўпэўнена ў тым, што тая ноч не была для яе сном і сюррэалістычнай гісторыяй. Я сказала «ўпэўнена»? Хм...

***

Агата ўспомніла, што яе чакае згустак з воску, які змерз і пакрыўдзіўся на дзяўчынку. Фігурка крыху паплавала і вырашыла прытуліцца да залацістага абадка. Што гэта можа быць?.. Фігурка падманвала Агату (а цень ад яе, здавалася, варушыўся і падазрона назіраў за дзяўчынкай). Бусел? Чайнік?.. Вада трымала васковае цела на паверхні, але яно нават і не думала ныраць. Т-а-а-ак... Няхай будзе бусел. Што ж такі першы вобраз. Цікава, што ён азначае?.. Засвяціўся кампутар — ажываліся квадратныя кнопкі. Хуценька станавіліся ў шэраг літары ў «Яндэксе». Агата спалохалася ад запытаў («Яндэкс», мабыць, таксама), калі ў радку з'явілася слова «гадание»: «Гадание онлайн», «Гадание да нет», «Гадание на отношение человека к тебе, что он думает обо мне». Адна спасылка, другая спасылка... Дзясяткі сайтаў — адно і тое ж. На ўсіх напісана, што бусел абазначае шчаслівае сямейнае жыццё! Вось яно як!

Але Агату чакала расколатая ёлачная цацка — дзяўчынка хутка перабегла да доміка, каб нічога не прапусціць.

***

Стол крыху скінуў вагу. Халадзец весела перавальваўся ў страўніках (ён уяўляў, як спускаецца з горкі і адразу трапляе на карусель (што ж, ягоная мара збылася!)), фаршыраваная рыба аддала ўсё, акрамя галавы, і ні аб чым не шкадавала, «Маскоўская» ганарліва пагладала на кампот. А на ўскрайку стала сабралася кампанія фанцікаў.

— Валер, можа, смажаную рыбу прынесці? — усхвалявана прагучалі словы Танішні.

— Не, не трэба. Я крыху бульбы з'ем ды хопіць.

Відэлец выбраў ахвяру — на талерцы ляжала абураная на жыццё бульба, цела якой раздвайлася.

— Як добра, што мы тэлевізар купілі! — сказала Антаніна, і яе мяккі позірк дакрануўся да зеленавата-арэхавых вачэй мужа.

На сям'ю паглядалі жыццярадасныя фігуркі, якіх хацелася памацаць, але пальцы краналіся толькі плёнкі ды пузатай абалонкі — экрана. Валерый падпытваўся да свята: набыў у краме каляровую плёнку і наклеіў яе, каб старэйшаму Генку было яшчэ цікавей назіраць за марыянеткамі. А хто імі кіруе? Няўжо ў гэтай каробцы жывуць людзі?.. Думкі малога, як кватаранты, пераходзілі ад аднаго суседа да другога. Але дарослыя баяліся пра гэта гаварыць, таму амаль штодзень, калі Антаніна была на працы, прыходзілі да Валерыя і разглядвалі каляровы экран, таемна шукаючы адказы.

Пакой сціснуў у абдымках вузкі ложак, калыску, невялічкі стол, елку з хлапушкамі, папяровымі ліхтарыкамі ды цукеркамі, кававую шафу, якая зачынялася на ключ. Са сцяны кожную раніцу распеўвалася шчакастае радыё, прыліп да бела-ружовых у маленькія палявыя кветкі шпалераў каляндар, які штомесяц паказваў малым язык. Блін з ляпнымі ўзорамі трымаў бэжава-белыя лямпы ў выглядзе каруселі. Некалькі разоў на дзень, калі дзверы давалі дазвол, халадзільнік «Мінск-2» зазіраў у пакой.

Валерый і Тоня патроху сцягвалі са стала агуркі, капусту, бульбу, а малы Гена — цукеркі. Каляровыя марыянеткі зацягнулі ў сваю казку ўсю сям'ю. Ніякіх размоваў не было. Толькі калі ў тэлевізійнай перадачы казалі «Віншуем!» — Валерый цягнуў гранёную шклянку да лямпаў і паўтараў за вядучымі. Антаніна падпявала і спрабавала разгледзець сукенкі ды хусткі выступоўцаў. Чатырохгадовы Генка скакаў каля елкі ды дражніў малую сястру.

Сям'я сядзела заварожаная. Яе захапілі тыя механічныя фігуркі, якія па сцэнарыю стварылі святочную атмасферу. У доміку, дзе свяцілі цеплынёй лямпачкі, абудзілася снежная цішыня. Здавалася, яна авалодала домікам. Прамаўлялі толькі каляровыя фігуркі. «Він...»

І тэлевізар патух.

— Што з ім? — напужалася Антаніна.

— Не ведаю. Зараз пагляджу.

Валерый пачаў круціць драты ды націскаць на кнопкі. Генка расчаравана паглядзеў на тэлевізар і сказаў, што свята скончылася. Ён надзьмуўся і сеў на мяккі пуфік. Алена не бачыла «маленькую трагедыю» — салодка заснула на руках у маці.

— Не хвалюйцеся. Зараз усё зраблю, — паабяцаў тата.

Але тэлевізар здаўся. Мо яму самому надакучылі ярка-фальшывыя марыянеткі?.. Валерый некалькі разоў абышоў яго, штосьці пакруціў, пастукаў, але нічога не адбылося.

— Ой, усё! Сядай, Валер. Трэба несці яго ў рамонт.

— Мам, а што мы будзем рабіць? Спаць? — скрозь слёзы спытаў Генка.

— Не. Можаш вершык расказаць ці песню праспяваць.

— Так! Давай, Генка! Усе мы заспяваем! — падхапіў ідэю жонкі Валерый і выцягнуў з самотнага кута залацістую трубу, на якой добра меў граць.

Гена паставіў пуфік насупраць ёлкі, ганарліва стаў на яго і заспяваў. Валерый падхапіў рытм, і труба прачнулася. Малінавыя вусны маленькай Алены нагадалі задаволены месяц. Цёплае шчасце апанавала Антаніну.

***

Як толькі на гадзінніку доўгая стрэлка спынілася на дванаццаці хвілінах першай начы, сценкі расколатай цацкі зліліся. Жоўтая лямпа заплюшчыла хітрае вока.

...Міргалі гірлянды, таемна пераліваўся дожджык. Пакой застыў у аксамітным святле ад ёлачных цацак.

А бусел з воску страпянуўся і...

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by